

«Манера гульні ў мяне дзёрзкая»

СТАР. 5



Калі ў блізкага выявілі дэменцыю...

СТАР. 7



Вырошчваем зяленіва... на падаконніку

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 снежня 2015 г. СЕРАДА № 243 (28101) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ГРУНТОЎНАЯ РАЗМОВА Ў МАСКВЕ

## ПРЭЗІДЭНТЫ БЕЛАРУСІ І РАСІІ ЎПЭЎНЕНЫ Ў ЯШЧЭ БОЛЬШЫМ ЗБЛІЖЭННІ НАШЫХ НАРОДАЎ



Фота БЕЛТА.

**Учора ў расійскай сталіцы адбыліся шматгадзінныя перагаворы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі. Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі самае шырокае кола двухбаковага супрацоўніцтва, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы вельмі добра ведаем, чаго хоча Расія ад Беларусі. Упэўнены, што Расія абсалютна ведае, што трэба Беларусі ад Расіі. Думаю, што вырашэнне тых праблем, якія ў нас існуюць, яшчэ больш зблізіць нашы народы. Хоць, шчыра кажучы, мераць нас з вамі класічнымі рамкамі ўзаемаадносін з іншымі дзяржавамі неяк нават нязручна, таму што ў нас настолькі блізкія адносіны, што тут не падыходзяць гэтыя крытэрыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Пуцін, у сваю чаргу, адзначыў, што прэзідэнтам дзвюх краін ёсць аб чым пагаварыць. У Расіі, паводле яго слоў, чакалі Аляксандра Лукашэнку з гэтым афіцыйным візітам і рады, што, нягледзячы на бягучыя праблемы, ён адбыўся, што беларускі лідар прыехаў для грунтоўнай размовы па ўсім комплексе пытанняў двухбаковых адносін.

Значная ўвага на перагаворах была ўдзелена развіццю інтэграцыйных адносін. «Эканамічныя выклікі, з якімі мы сутыкаемся ў цяперашні няпросты час, не павінны весці да раз'яднанасці дзяржаў — удзельніц дагавораў аб стварэнні Саюзнай дзяржавы і аб Еўразійскім эканамічным саюзе», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Ён заявіў, што ў беларускіх вытворцаў добрая рэпутацыя на рынку Расіі. «Мы гатовы ўсямерна садзейнічаць у задавальненні патрэбнасцей расійскага рынку па тых групах тавараў, якія мы можам вырабляць канкурэнтна па цане і якасці», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Ён нагадаў, што шэраг ключавых экспартных пазіцый Беларусі вырабляецца з расійскіх камплектуючых, расійскай сыравіны, гэта значыць з'яўляецца рэальным прадуктам беларуска-расійскай кааперацыі.

Прэзідэнты падрабязна абмеркавалі пытанні роўнага доступу беларускіх тавараў на расійскі рынак. «Мы атрымалі падтрымку Прэзідэнта Расіі ў гэтым плане», — праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь рэалізуе другую праграму імпартазамяшчэння і набыла пэўны вопыт у гэтай сферы. Гаворачы аб аналагічнай праграме ў Расіі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта рух у абсалютна правільным напрамку. «Вынік будзе, і літаральна ў бліжэйшым будучым, — перакананы кіраўнік беларускай дзяржавы. — Але гэта праграма ні ў якім разе не павінна пагаршаць магчымасці і ўмовы дзеяння нашых сумесных прадпрыемстваў, тым больш паставак беларускіх тавараў і паслуг», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Каб нашы тавары і паслугі не лічыліся замежнымі, а былі практычна як расійскія», — дадаў ён. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу, што такія роўныя магчымасці і ўмовы паставак беларускіх тавараў і паслуг замацаваны двухбаковымі пагадненнямі і нормамі ЕАЭС.

Уладзімір Пуцін адзначыў, што асаблівая ўвага на перагаворах была ўдзелена развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. «У гэтым годзе з-за рэзкіх курсавых ваганняў на валютных рынках тавараабарот у доларавым вылічэнні знізіўся, а ў рублёвым, наадварот, узрос на 20,6 працэнта да 1,3 трлн расійскіх рублёў, — канстатаваў ён. — На гэты вынік мы выйшлі ў тым ліку дзякуючы таму, што расійскія і беларускія кампаніі ўсё больш актыўна разлічваюцца ў нацыянальных валютах. Гэта прыкладна 86 працэнтаў ад агульнага тавараабароту».

Прэзідэнт Расіі нагадаў, што на дасягненне ўстойлівага росту тавараабароту накіравана і рэалізацыя зацверджанага ўрадамі дзвюх краін плана мерапрыемстваў па стварэнні дадатковых умоў па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «У ліку прыярытэтных задач — павышэнне канкурэнтаздольнасці нашых прадпрыемстваў, нарошчванне прамысловай кааперацыі, правядзенне ўзгодненай палітыкі ў сферы імпартазамяшчэння, стымуляванне ўзаемных інвестыцый», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін задаволены характарам і вынікамі ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі на міжнароднай арэне. Адносіны міністэрстваў замежных спраў дзвюх краін маглі б служыць прыкладам для супрацоўніцтва іншых ведамстваў, адзначыў у сувязі з гэтым Прэзідэнт Беларусі.

Абмяркоўваючы міжнародны парадак дня, прэзідэнты таксама гаварылі аб Украіне, аб сітуацыі на Блізкім Усходзе, аб іншых гарачых кропках планеты. «Беларусь па-суседску зацікаўлена ў міры на ўкраінскай зямлі», — сказаў лідар беларускай дзяржавы. Такой жа пазіцыі краіна прытрымліваецца і наконт сітуацыі на Блізкім Усходзе. «І разыходжанняў у нас з Прэзідэнтам Расіі абсалютна няма па гэтых праблемах», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Зямлю трасе ад міжусобіц і ўзброеных канфліктаў. Бежанцы вылічваюцца ўжо мільёнамі. Міжнародны тэрарызм кінуў выклік усяму свету. Толькі за апошні месяц мы сутыкнуліся з чарадой бесчалавечных, варварскіх дзеянняў тэрарыстаў, якім няма і не можа быць апраўдання», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Не засталося ніводнага пытання, якое мела б патрэбу ў паглыбленай прапрацоўцы, сказаў беларускі лідар. Паводле яго слоў, ёсць некалькі пытанняў, якія на працягу тыдня будуць дапрацаваны, і ўрады прымуць па іх рашэнні.

Прэзідэнты Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін падпісалі сумесную заяву, у якой, у прыватнасці, гаворыцца, што Беларусь і Расія дамовіліся скаардынаваць намаганні ў Саюзнай дзяржаве і Еўразійскім эканамічным саюзе па стварэнні дадатковых умоў для павелічэння аб'ёмаў узаемнага гандлю і павышэння дзелавой актыўнасці рэальнага сектара эканомік дзвюх дзяржаў. Дабівацца пастаўленай мэты бакі маюць намер у тым ліку шляхам правядзення ўзгодненай прамысловай і аграпрамысловай палітыкі, развіцця інвестыцыйнага і інавацыйнага супрацоўніцтва, рэалізацыі сумесных кааперацыйных, а таксама інфраструктурных праектаў, устаранення бар'ераў у двухбаковым гандлі, актывізацыі міжрэгіянальнага супрацоўніцтва як адной з фундаментальных асноў двухбаковага ўзаемадзеяння.

Беларусь і Расія прадоўжаць работу па забеспячэнні роўнасці правоў грамадзян, інтэнсіфікуюць супрацоўніцтва ў гуманітарнай і культурнай сферах, прадоўжаць каардынацыю супрацоўніцтва на міжнароднай арэне. Краіны будуць прымаць актыўны ўдзел ва ўмацаванні міру і стабільнасці, у тым ліку ў прадухіленні і мірным урэгуляванні міжнародных канфліктаў, постканфліктным светабудаўніцтве і процідзеянні такім выклікам і пагрозам, як міжнародны тэрарызм, распаўсюджванне зброі масавага знішчэння.

У заяве гаворыцца аб намеры пашыраць ідэю гарманізацыі інтэграцыйных працэсаў на захадзе і ўсходзе Еўразіі ў міжнародных арганізацыях і шматбаковых форумах, а таксама з асноўнымі партнёрамі на Еўразійскім кантыненце, прадаўжаць работу па спалучэнні ЕАЭС і кітайскай ініцыятывы эканамічнага пояса Шаўковага шляху з улікам інтарэсаў усіх бакоў працэсу.

■ Актуальна

## Прыняты комплекс мер супраць «чорных капальнікаў»

**У краіне зацверджаны комплекс мер, накіраваны на стварэнне дадатковых умоў для захавання культурнай спадчыны краіны, а таксама прадухіленне дзейнасці «чорных капальнікаў». Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, адпаведны ўказ №485, накіраваны на ўдасканаленне аховы археалагічных аб'ектаў і артэфактаў, падпісаў Аляксандр Лукашэнка.**

Дакументам прадугледжана перадача археалагічных артэфактаў, выяўленых пры правядзенні археалагічных даследаванняў або выпадкова, у дзяржаўную ўласнасць. Устаноўлены таксама парадак ажыццяўлення пошуку археалагічных аб'ектаў і артэфактаў, вызначаны парадак інфармавання мясцовых органаў аб выяўленых археалагічных аб'ектах і перадачы знойдзеных артэфактаў ва ўласнасць дзяржавы.

Выкарыстанне металашукальнікаў, геарадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў для пошуку археалагічных аб'ектаў і артэфактаў дапускаецца толькі пры правядзенні ва ўстаноўленым парадку археалагічных даследаванняў.

Уведзена забарона на набыццё, продаж, дарэнне, мену, залог археалагічных артэфактаў. Выключэнне прадугледжана для дзяржаўных навуковых арганізацый і дзяржаўных музеяў, а таксама для фізічных і юрыдычных асоб, якія да 1 студзеня 2017 года ўключаць існуючыя ў іх уласнасці археалагічныя артэфакты ў рэестр археалагічных артэфактаў.

■ Прамая лінія

## А З СУСЕДЗЯМІ ЛЕПШ СЯБРАВАЦЬ...




Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**Ужо традыцыйна не менш як раз на год «Звязда» праводзіць кансультацыі па зямельных пытаннях і сферы нерухомай маёмасці з кіраўнікамі органаў кіравання вышэйшага рангу. На гэты раз на «прамую лінію» да старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэя Гаева дазваніліся каля двух дзясяткаў нашых чытачоў. Андрэй Анатольевіч імкнуўся зразумела адказаць на жыццёвыя пытанні (а камусьці і нешта параіць) усіх нашых падпісчыкаў. Прапануем вашай увазе самыя актуальныя тэмы гэтай размовы.**

### Супраць незразумелай ацэнкі існуе экспертыза

**Людміла Іосіфаўна, горад Мінск:**

***— Як падлічваецца кошт прыватнага жылля пры яго зносе? У нашым выпадку ацэншчыкі паведамілі, што ацэньваюць кватэры «па сярэднім». А нам гэта незразумела. Калі жыллё прадаецца на рынку, то там улічваецца і раён, і вышыня столяў. У нас кватэра — «сталінка» ў Цэнтральным раёне сталіцы. Вышыня столі ў кватэры нестандартная. Няўжо пры зносе гэта не мае значэння?***

— У гэтым выпадку дзейнічае пастанова ўрада, якая вызначае патрабаванні па ажыццяўленні ацэнкі, але ўвогуле ацэнка такой маёмасці робіцца без уліку фактараў зносу, а з улікам агульных фактараў па правядзенні ацэнкі. Нейкіх выключэнняў тут не існуе. Таму вам неабходна патрабаваць ад адказных асоб, каб яны растлумачылі — якія канкрэтныя нормы і нарматывы выкарыстоўваюцца пры гэтай ацэнцы.

СТАР. 3

■ Абмяркуем

## АБІТУРЫЕНТАМ МОГУЦЬ ДАЗВОЛІЦЬ ЗДАВАЦЬ ЧАТЫРЫ ДЫСЦЫПЛІНЫ НА ЦТ...

### ...але гэта адбудзецца не раней за 2017 год




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Падчас будучай прыёмнай кампаніі Міністэрства адукацыі плануе захаваць «парогавыя» значэнні балаў на ЦТ, якія дазваляюць абітурыентам удзельнічаць у конкурсе на званне студэнта ВНУ, на ўзроўні 2015 года. Пра гэта на калегіі, дзе аналізаваўся набор абітурыентаў на ўсе ступені прафесійнай адукацыі, паведаміў першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.**

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Без долара

Прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў заклікаў партнёраў па Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) далучыцца да правядзення аперацый у нацыянальных валютах з РФ. Такую заяву ён зрабіў на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў краін ШАС у пашыраным складзе. Мядзведзеў нагадаў, што на Маскоўскай біржы запушчаны пілотны праект — платформа па гандлі валютнымі парамі рубель-юань і рубель-тэнге без пасярэдніцтва долара. «І ўсіх мы таксама запрашаем далучыцца да падобных ініцыятыў», — дадаў прэм'ер РФ.

### Пасольствы ЗША будуць правяраць акаўнты ў сацсетках

Супрацоўнікі пасольстваў ЗША пакідаюць за сабой права правяраць акаўнты суіскальнікаў у сацыяльных сетках у працэсе выдачы ўязных віз у краіну. Пра гэта паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на заяву афіцыйнага прадстаўніка дзярждэпартамента ЗША Джона Кірбі. Паводле яго слоў, калі супрацоўнік консульскай службы ў ходзе гутаркі адчувае неабходнасць праверыць старонку суіскальніка ў сацыяльных сетках, то такая праверка будзе праведзена. Падкрэсліваецца, што адсочванне актыўнасці людзей у сацсетках не будзе адбывацца ў абсалютна кожным выпадку. Раней газета Wall Street Journal паведамляла, што Міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША распрацоўвае план па вывучэнні паведамленняў у сацыяльных сетках, перш чым выдаваць пэўным асобам дазвол на ўезд у краіну.




### Мансерат Кабалье прысудзілі да паўгода турмы

Іспанскую оперную спявачку Мансерат Кабалье прысудзілі да шасці месяцаў турэмнага зняволення за махлярства, паведамляе іспанскае выданне ABC. Адзначаецца, што 82-гадовая выканаўца, якая па дакументах пражывае ў Андоры, утойвала ад падатковых органаў Іспаніі ганарары за выступленні. На судовым слуханні ў Барселоне 15 снежня Кабалье таксама абавязалі выплаціць дзяржаве штраф у памеры амаль 255 тысяч еўра. Акрамя таго, яна не зможа атрымліваць дапамог і субсідый з бюджэту краіны на працягу паўтара года. Спявачка не прысутнічала на пасяджэнні суда, спаслаўшыся на дрэннае самаадчуванне. З дапамогай відэаканферэнцсувязі з дома яна зрабіла заяву, у якой цалкам прызнала сваю віну.



ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Неда- і перасып небяспечныя для здароўя



Па словах навукоўцаў з Універсітэта Сіднея, калі чалавек спіць занадта шмат (больш як 9 гадзін за ноч), ён рызыкуе памерці раней тэрміну, перадае Science World Report. Эфект празмернага сну параўноўваецца з сядзеннем больш за 7 гадзін за дзень і наяўнасцю менш як 150 хвілін трэніровак у тыдзень. Разам усе гэтыя складнікі жыцця многіх сучасных людзей гэтак жа негатыўна адбіваюцца на арганізме, як і спажыванне алкаголю або шкоднай ежы. Навукоўцы даследавалі лад жыцця 2,3 млн аўстралійцаў ва ўзросце 45 гадоў і старэйшых. Эксперты адразу ўлічылі адназначна небяспечныя для жыцця фактары. Але па-сапраўднаму іх здзівіў уплыў рэжыму сну. Дрэнна адбіваўся і недасып (меней за 7 гадзін за ноч), і лішак сну (больш за 9 гадзін). Адназначна рызыку ранняй смерці павышалі сядзячы лад жыцця і недахоп фізічнай актыўнасці. Пры гэтым менш за 7 гадзін сну разам з курэннем і спажываннем спіртнога павышалі рызыку ранняй смерці ў 4 разы. Яшчэ смяротныя камбінацыі: недахоп актыўнасці і лішак сну; недахоп трэніровак, сядзячы лад жыцця, курэнне і любоў да спіртнога.

КОРАТКА

**Рэнтабельнасць продажаў арганізацый краіны ў студзені—кастрычніку бягучага года склала 8,1 % і павялічылася ў параўнанні з аналагічным перыядам 2014-га на 0,5 %.**

Беларускі фільм «У вайны не жаночы твар», аўтарам сцэнарыя якога з'яўляецца Святлана Алексіевіч, пераведзены ў лічбавы фармат. Гэты дакументальны фільм зняты ў 1981 годзе рэжысёрам Віктарам Дашуком. Акрамя гэтай карціны, у лічбавы фармат пераведзены таксама фільм «Боль» па сцэнарыі нобелеўскай лаўрэаткі.

**Ствараць валютны саюз краін ЕАЭС наўрад ці давядзецца раней за 2025 год. Аб гэтым у інтэрв'ю «Российской газете» заявіў старшыня калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Віктар Хрысценка.**

Рабочая група па бяспецы кантактнай групы па ўрэгуляванні сітуацыі на ўсходзе Украіны ўзгадніла пералік зон для размініравання ў Данбасе, у якія ўключаны 43 раёны. На тэрыторыі 12 з іх работы павінны пачацца да канца года, а на 5 яны ўжо пачаліся.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## ІДЭІ ПАДКАЗВАЕ ЛЮБІМАЯ ГАЗЕТА

### Вячаслаў КЛІМОВІЧ, дырэктар Веснаўскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця




— «Звязда» — газета, з якой я крочу па жыцці, мой бацька заўсёды яе выпісваў. Люблю яе і за тое, што разам з ёй вырас, і за тое, што яна на беларускай мове.

На жаль, эканамічныя ўмовы не спрыяюць таму, каб наша ўстанова змагла павялічыць колькасць падпісных выданняў. Нечым даводзіцца ахвяраваць. Але роднай газеце не здраджваем, выпісалі на дом-інтэрнат і зрабілі больш за 10 індывідуальных падпісак. Магчыма, маладым зручней чытаць навіны ў інтэрнэце, але я з таго пакалення, якое прывыкла трымаць газету ў руках. Мой сын таксама, як і я, вырас на «Звяздзе». Маленькім бег да паштовай скрыні, каб хутчэй дастаць чарговы нумар і першым пагартаць.

У мяне сабраўся ўжо цэлы стос выразак са «Звязды» з рознымі цікавымі ідэямі. Там шмат карысных прапаноў па добраўпарадкаванні, практычных парад. Перачытваю і выкарыстоўваю іх у сваіх справах. Супрацоўнікі не перастаюць здзіўляцца, адкуль у мяне столькі прапаноў. «Звязда» дапамагае мне займацца любімай справай. Я пчаляр і не прапускаю ніводнага матэрыялу пра пчолатэрапію. Наогул, гэта газета, з якой прыемна сябраваць.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**Фота аўтара**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I паўгоддзе 2016 года!

5 разоў на тыдзень!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

## КАЗАХСТАН ПА ПРАВЕ ГАНАРЫЦЦА ДАСЯГНЕННЯМІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан Нарсултана Назарбаева з нацыянальным святам — Днём Незалежнасці.**

«Казахстан па праве ганарыцца дасягненнямі ва ўмацаванні дзяржаўнасці, забеспячэнні грамадскай згоды, пабудове эфектыўнай эканомікі, умацаванні міжнароднага аўтарытэту», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што стратэгічныя саюзніцкія адносіны паміж Беларуссю і Казахстанам, якія вылучаюцца нязменнай узаемнай падтрымкай і высокай выніковасцю сумеснай працы, будуць і далей паглыбляцца на карысць дзвюх краін.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ Парламенцкі дзённік

# КАБ «КРЫМІНАЛЬНЫ ВОПЫТ» НЕ ПЕРАДАВАЎСЯ,

## асуджаных першы раз будуць трымаць асобна

**Менавіта гэтага аспекту датычацца асноўныя змены і дапаўненні ў Крымінальна-выканаўчы кодэкс, якія дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі ў першым чытанні на ўчарашняй сесіі. Такім чынам, на думку распрацоўшчыкаў законапраекта і дэпутатаў, зменшыцца пераемнасць у крымінальным асяроддзі.**

— Мы б не хацелі, каб крымінальны вопыт адных перадаваўся іншым нават ва ўмовах установ адкрытага тыпу, — заявіў **Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў.** — Зразумела, што такі працэс адбываецца ў нейкай меры, аднак мы імкнёмся мінімізаваць гэтыя магчымасці ў тым ліку і для таго, каб зрабіць далейшую сацыялізацыю такіх грамадзян больш эфектыўнай.

Трэба сказаць, што гэтае новаўвядзенне ў Крымінальна-выканаўчы кодэкс базуецца на вопыце сусветных краін. Большая частка тых людзей, што сядзелі ў турме ўпершыню, пасля сацыялізуюцца і жывуць нармальным жыццём, не звязаным са злачынным светам.

### ЯК АДСАЧЫЦЬ ТЫХ, ХТО ЕДЗЕ Ў ІДІЛ?

Адказваючы пасля прадстаўлення законапраекта на пытанні журналістаў пра тое, ці ёсць грамадзяне нашай краіны, што далучыліся ці імкнуцца далучыцца да ІДІЛ, міністр унутраных спраў паведаміў, што такія прэцэдэнты ёсць.

— Няма дакладных спосабаў, якія выяўлялі б, дзеля чаго чалавек едзе за мяжу, — адзначыў міністр. — Ён, безумоўна, не дэкларуе свайго жадання ваяваць. Проста едзе, умоўна кажучы, у Турцыю, нейкім чынам трапляе на тэрыторыю так званай «Ісламскай дзяржавы». Мы можам казаць пра ўдзел у гэтым працэсе толькі тады, калі ёсць фактычныя даныя. У гэтым выпадку органы ўнутраных спраў, спецслужбы могуць рабіць адпаведныя высновы. Такія прэцэдэнты ёсць, таксама як і з тымі, хто ўдзельнічае ў баявых дзеяннях на тэрыторыі Украіны. Па кожным вядомым выпадку мы праводзім праверку.

Адказваючы на пытанне пра колькасць тых, хто едзе ў ІДІЛ з нашай краіны, Ігар Шуневіч паведаміў, што, згодна з яго звесткамі, такіх людзей больш за 10.

### ЗА ПАРУШЭННЕ ТЭХРЭГЛАМЕНТУ — ДА 200 БАЗАВЫХ

**Эдуард СЯНЬКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве,** расказаў пра новаўвядзенні ў Крымінальным кодэксе, Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях, Працэсуальна-выканаўчым кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях.

— Змены тычацца абароны айчыннага рынку ад паставак недабраякаснай прадукцыі, якая не адпавядае тэхнічнаму рэгламенту Мытнага саюза і Еўразійскага эканамічнага саюза, — паведаміў дэпутат. — Узмацняецца адміністрацыйная адказнасць за пастаўку такой прадукцыі ў нашу краіну.

Па словах парламентарыя, прадугледжваецца павелічэнне да 200 базавых велічынь адказнасці за парушэнне тэхрэгламенту.

— Мы ўваходзім у Мытны саюз, таму ідзе ўніфікацыя заканадаўства, — патлумачыў Эдуард Сянькевіч. — Падобная адміністрацыйная адказнасць ужо ўведзена ў Расіі і Казахстане.

### ГАРАНТЫЯ БЯСПЕКІ

Бяспека на прадпрыемстве, умацаванне працоўнай дысцыпліны — асноўная мэта змен, што ўносяцца ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

— У першую чаргу змены ў кодэкс накіраваны на ўзмацненне працоўнай дысцыпліны і, як вынік, на зніжэнне вытворчага траўматызму і дарожна-транспартных здарэнняў, — адзначыў **Ігар СТАНКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.** — Перш за ўсё — узмацненне адказнасці працадаўцы ў тым, што тычыцца праходжання медыцынскіх аглядаў работнікаў — як перад пачаткам працы, так і ў працэсе.

Узмацняецца адказнасць кіраўніка за непраходжанне работнікамі агляду на алкагольнае, таксічнае, наркатычнае ап'яненне.

— Гэта звязана перш за ўсё з тым, што ў законе Рэспублікі Беларусь аб ахове працы гэтыя патрабаванні выкладзены — гэта значыць, людзі, якія працуюць ва ўмовах павышанай небяспекі, у шкодных умовах працы, абавязаны праходзіць медыцынскі агляд. У першую чаргу гэта звязана з тым, што няшчасныя выпадкі на вытворчасці часта з'яўляюцца вынікам знаходжання работніка ў стане алкагольнага ап'янення.

### ПРАВА НА ТАВАРНЫ ЗНАК

У другім чытанні быў прыняты законапраект, што ўносіць змены і дапаўненні ў некаторыя законы нашай краіны па пытаннях прававой аховы таварных знакаў і знакаў абслугоўвання.

— Правапрымяняльная практыка паказала: гэтыя змены неабходны, таму што закон быў прыняты ў 1993 годзе, у новай рэдакцыі — у 2000 годзе, — заўважыў **Васіль МІХНО, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.** — Змены тычацца, перш за ўсё, двух асноўных пунктаў. Па-першае, гэта выключнае права на таварны знак, па-другое, адказнасць за парушэнне гэтага выключнага права.

Васіль Міхно падкрэсліў, што кожны, хто вырабляе прадукцыю, павінен мець права на таварны знак. Парушэнне выключнага права цягне за сабой санкцыі ў значным памеры — да 50 тысяч базавых велічынь.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

18 снежня 2015 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Тры пытанні да ўлады

# У КРУПКАХ МАЛОЛІ ЗНАТНЫЯ КРУПКІ



**Крупскі раён, што на Міншчыне, выцягнуты з поўначы на поўдзень і сваімі контурамі нагадвае вялікае сэрца. У маі 1991 года яго адміністрацыйны цэнтр — гарадскі пасёлак Крупкі — атрымаў статус горада. Ёсць некалькі версій паходжання назвы паселішча. Па адной з іх, некалі на рацэ Бобр стаяў млын, дзе малолі знатныя крупы, якія адпраўлялі за мяжу, у тым ліку і ў Амерыку. Крупкі ўключаны ў склад рэспубліканскіх турыстычных праграм, якія маюць на мэце экалагічны турызм, адпачынак выхаднога дня, адпачынак для дарослых і дзяцей.**

**Чым прывабныя Крупкі для турыстаў, што тут могуць ім прапанаваць? Пра гэта і іншае расказаў старшыня Крупскага райвыканкама Ігар ЧАСНОК.**

***— Ігар Мікалаевіч, мне здаецца, Крупшчына перспектыўная ў плане турызму. Што вы, як кіраўнік раёна, параілі б паглядзець наведнікам?***

— У вёсцы Белае нашага раёна нарадзіўся лётчык-касманаўт Уладзімір Кавалёнак. Яму ўстаноўлены помнік у цэнтры горада. Адна з экспазіцый у гісторыка-краязнаўчым музеі прысвечана Уладзіміру Васільевічу. Тут знаходзіцца скафандр, у якім ён лятаў у космас, а таксама іншыя яго рэчы, кнігі. Уладзімір Кавалёнак рэгулярна наведвае сваю радзіму, уручае выпускнікам на гарадской плошчы ва ўрачыстай абстаноўцы атэстаты аб заканчэнні школы. Наш славуты зямляк тройчы пабываў у космасе. Аднойчы яго спыталі: калі б прапанавалі яшчэ раз паляцець, ці згадзіўся б? На што ён адказаў: «Калі б гэта было патрэбна для маёй краіны, то зрабіў бы, не задумваючыся».

У вёсцы Асечана нарадзілася неаднаразовая алімпійская чэмпіёнка па акадэмічнай грэблі Кацярына Карстан. У музеі захоўваюцца яе ўзнагароды, асабістыя рэчы. Усяго ж крупская зямля дала Беларусі 11 Герояў Савецкага Саюза. Тут пачыналі свой шлях 200 дактароў і кандыдатаў навук, вядомыя мастакі, паэты, пісьменнікі.

***— Раён славіцца не толькі людзьмі, але і цікавымі гістарычнымі помнікамі. Ці не так?***

— Сапраўды, возьмем, напрыклад, сядзібу Карла і Марыі Свяцкіх. Яна ўзведзена ў пачатку XX стагоддзя. З сядзібнага комплексу да нашых дзён захаваліся дом, фрагменты парку, гаспадарчыя пабудовы. У 1896 годзе памешчык заснаваў фабрыку запалкавай саломкі, дзе працавалі 50 чалавек. Па тым часе — буйное прадпрыемства. Большасць прадукцыі экспартавалася ў Амерыку. Акрамя таго, пан валодаў ганчарным, мукамольным заводамі.

Сінагога XIX стагоддзя і касцёл у гонар Святога Іосіфа таксама адносяцца да славутасцяў Крупак. Раней на гарадской плошчы стаяла царква другой паловы XIX стагоддзя. У часы ваяўнічага атэізму храм разбурылі. Але вернікі ноччу закапалі малы купал у агародзе. Гэтыя людзі жылі на вуліцы Ленінскай. Калі ў 90-х гадах сабралі грошы на будаўніцтва новай царквы, мясцовыя старажылы ўспомнілі пра схаваную святыню. Адшукалі яе і ўстанавілі на храме. Яго адкрываў і асвячаў у 1999 годзе мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. У вёсках Худаўцы і Грыцкавічы — цікавыя драўляныя цэрквы Нараджэння Багародзіцы і Свята-Праабражэнская. У вёсцы Калодніца драўляная царква не захавалася, але яе руіны зачароўваюць.

***— Крупская зямля — найпрыгажэйшы куток Беларусі і па сваёй прыродзе. Тут знаходзіцца непаўторны ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Сялява». Як выкарыстоўваюцца гэтыя перавагі ў мэтах турызму, адпачынку?***

— На Выспе, што пасярод возера Сялява, знойдзены першыя паселішчы людзей 3-га тысячагоддзя да нашай эры, скарб, старадаўняе скроневае жаночае ўпрыгажэнне, печ для выплаўкі жалеза і шмат іншага.

Па адной з версій, у 1942 годзе ў возера ўпаў бамбардзіроўшчык «ПЕ-8», які перавозіў золата па папярэдніх пастаўках па ленд-лізе ў Англію. А ў возеры Стаячым нібы затоплены скарб Напалеона. Гэта ўсё прываблівае ў раён рамантыкаў, турыстаў, якія хочуць разгадаць таямніцы, што хаваюць водныя хвалі.

Параўнальна нядаўна на беразе возера Сялява пабудаваны кемпінг, які адпавядае еўрапейскім стандартам. Такіх у Беларусі больш няма. Тут створаны ўмовы як для актыўнага, так і для пасіўнага адпачынку, прапаноўваюцца разнастайныя водныя забавы, купанне, рыбалка, катанне на лодках. У кемпінгу ёсць гасцявыя домікі на два і тры месцы, двухпакаёвыя і аднапакаёвыя палаткі (а таксама месцы, дзе турысты могуць паставіць свае). Гэта дазволіла ўпершыню правесці рэспубліканскі турысцка-спартыўны злёт кемпераў. У ім прынялі ўдзел аматары з Беларусі, Расіі, Літвы, Украіны, Латвіі. Спадзяюся, што гэтая традыцыя замацуецца на нашай зямлі і дазволіць прыцягнуць новых турыстаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■

■ Меркаванне

# ШАХМАТНАЯ ПАРТЫЯ: БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ



**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка знаходзіўся ў Маскве з двухдзённым афіцыйным візітам па запрашэнні расійскага Прэзідэнта Уладзіміра Пуціна. Сустрэча павінна была адбыцца яшчэ ў канцы лістапада, але была перанесена. Афіцыйная фармулёўка — занятасць прэзідэнтаў. Сумнявацца ў гранічна жорсткім графіку дзяржаўных лідараў можа толькі той, хто ніколі не працаваў на дзяржаўнай службе, вышэйшай за сярэдні ўзровень. Бо ступень свабоды лідара адваротна прапарцыянальная колькасці тэлефонаў на яго працоўным стале.**

За час, на які быў адкладзены прыезд, адбыліся візіты кіраўніка Беларусі ў В'етнам і Туркменістан. У Ашхабадзе Аляксандр Лукашэнка выступіў на міжнароднай канферэнцыі «Палітыка нейтралітэту: міжнароднае супрацоўніцтва ў імя міру, бяспекі і развіцця». Пазіцыя Прэзідэнта Беларусі відавочная: развіваць эканамічную інтэграцыю двух суб'ектаў сусветнай эканомікі пры захаванні «свабоды рук» у палітыцы. Адсюль вынікае ідэя ператварэння Мінска ў дыялогавую пляцоўку Усходу і Захаду, якая выглядае гладка на паперы, але хавае ў сабе мноства геапалітычных «яроў».

Вядома, ідэя нейтралітэту перспектыўная ва ўмовах глабальнай стабільнасці, зразумелых правілаў гульні. Але што рабіць тады, калі вы расстаўляеце фігуры для шахматнай партыі, а ваш заакіянскі партнёр гуляе нават не ў шашкі, а «навылёт у «Чапаева», у «пстрычкі»?

Свет мяняецца, і не ў лепшы бок. Гэты працэс набывае ўсё большую глыбіню і дынаміку, а разам з гэтым мяняецца і Еўропа. І Беларусі тут выпадае асаблівая роля. Сёння беларускі вопыт адміністравання ў складаных знешніх умовах, яе інтэлектуальныя і вытворчыя рэсурсы патрэбны не ва ўтапічных, а ў цалкам прагматычных праектах, якія адпавядаюць духу беларусаў як нацыі міралюбных працаўнікоў.

У шахматнай партыі, якую ў гэтыя дні раскладваюць на дваіх Прэзідэнты Расіі і Беларусі, фігуры абодвух гульцоў — на белым баку дошкі. Супраць іх — цёмная нявызначанасць сусветнай эканомікі і знешнепалітычныя рызыкі, невядомыя свету з ваенных часоў. І тым не менш я ўпэўнены ў сумеснай перамозе нашых Прэзідэнтаў. Бо мы на адным баку.

**Мікалай МЯЖЭВІЧ,**
**доктар эканамічных навук,**
**прафесар кафедры еўрапейскіх даследаванняў**
**факультэта міжнародных адносін**
**Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта**

■

# АБІТУРЫЕНТАМ МОГУЦЬ ДАЗВОЛІЦЬ ЗДАВАЦЬ ЧАТЫРЫ ДЫСЦЫПЛІНЫ НА ЦТ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Нагадаем, што сёлета для першай і другой профільных дысцыплін тэставыя балы, якія прыраўноўваюцца на цэнтралізаваным тэсціраванні да нездавальняючай адзнакі, былі дыферэнцаваныя. Скажам, калі матэматыка, фізіка, хімія, біялогія былі першай профільнай дысцыплінай, то нездавальняючымі прызнаваліся адзнакі ад 0 да 14 балаў. Станоўчым вынікам лічыліся 15 балаў і больш. А калі тыя ж дысцыпліны былі другім профільным іспытам, то планка патрабаванняў зніжалася, і абітурыенту дастаткова было набраць усяго 10 балаў.

Пры дадатковым наборы «парогавыя» значэнні прахадных балаў па выніках цэнтралізаванага тэсціравання заставаліся аналагічнымі асноўнаму набору. На вакантныя месцы маглі прэтэндаваць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе пры паступленні ў іншыя ВНУ, але мелі на руках патрэбныя сертыфікаты або паступалі на іншыя спецыяльнасці ў тую ж ВНУ.

На думку кіраўніцтва галоўнага адукацыйнага ведамства, дадатковы набор (другую ітэрацыю) можна было б пашырыць на ўсе спецыяльнасці не толькі дзённай, але і завочнай (у тым ліку дыстанцыйнай) і вячэрняй формаў атрымання адукацыі.

Міністэрства адукацыі ўжо накіравала ва ўрад свае прапановы па ўдасканаленні правілаў прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

У прыватнасці, прапануецца прадаставіць права паступлення на педагагічныя спецыяльнасці без уступных іспытаў выпускнікам профільных педагагічных класаў, якія маюць адзнакі 7 балаў і вышэйшыя па ўсіх школьных прадметах і не ніжэйшыя за 8 балаў — па вучэбных прадметах, прадугледжаных пры паступленні на спецыяльнасць педагагічнага профілю.

Ёсць прапанова прадаставіць права паступаць на завочную платную форму навучання без абмежаванняў па наяўнасці і працягласці працоўнага стажу.

Таксама галоўнае адукацыйнае ведамства прапануе прызнаваць вынікі ЦТ сапраўднымі на працягу двух гадоў, уключаючы год здачы ЦТ. Гэта значыць, што абітурыент, якому не пашанцавала з паступленнем, зможа на наступны год паспрабаваць з тымі ж сертыфікатамі зноў паўдзельнічаць у конкурсным адборы.

Ужо неаднаразова прапаноўвалася дазволіць абітурыентам здаваць на ЦТ замест трох чатыры дысцыпліны, каб пашырыць іх магчымасці пры выбары спецыяльнасці і зменшыць шанцы застацца за бортам прыёмнай кампаніі. Скажам, пры паступленні на хімічны факультэт БДУ на спецыяльнасць «хімія лекавых злучэнняў» трэба здаваць хімію і біялогію, а на «хімію высокіх энергій» — хімію і матэматыку. І калі абітурыент не праходзіць па сваіх балах на вельмі запатрабаваную ў моладзі першую спецыяльнасць, то ён не можа падаць свае дакументы і на ўсе іншыя спецыяльнасці хімічнага факультэта. Дык чаму б ім не дазволіць здаваць і хімію, і біялогію, і матэматыку? Плюс для ўсіх застаецца абавязковае ЦТ па дзяржаўнай мове... Калі гэтая прапанова Міністэрства адукацыі будзе зацверджана, то абітурыенты 2017 года ўжо змогуць скарыстацца такой магчымасцю.

Таксама будзе прадугледжана некалькі рэзервовых дзён для здачы ЦТ, каб у абітурыентаў, якія захварэлі падчас «асноўнай хвалі», была магчымасць дагнаць упушчанае, або ў тых жа выпускнікоў расійскіх школ, якія не паспяваюць у чэрвені прыехаць у Беларусь і здаць ЦТ з-за сваіх экзаменаў, быў шанц паўдзельнічаць у конкурсе на бюджэтныя месцы.

**Рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля БАРАНАВА** прапанавала палепшыць інфармаванне абітурыентаў пра сітуацыю, якая складваецца з конкурсам. У апошнія гады, нагадаем, абнаўленне інфармацыі пра колькасць пададзеных дакументаў адбываецца кожныя тры гадзіны: у 9.00, 12.00, 15.00 і 18.00 штодня.

— Менавіта з гэтай мэтай у нашым універсітэце інфармацыя пра колькасць дакументаў, што падаюцца на ўсе спецыяльнасці, паступае да абітурыента ў рэжыме анлайн: гэта здымае шмат пытанняў, таму што абітурыенты могуць у любы зручны для іх час (у 10 гадзін, у 17, хоць ноччу) атрымаць самую актуальную інфармацыю і своечасова падрыхтавацца або да свайго поспеху, або да праблем, з якімі давядзецца сутыкнуцца, — падкрэсліла Наталля Баранава. — Мы лічым мэтазгодным укараніць у практыку працы прыёмных камісій інфармаванне абітурыентаў пра бягучы прахадны бал. Мы гэта спрабавалі рабіць, і мушу канстатаваць, што такая мера дапамагае зменшыць напружанне на востра запатрабаваных у абітурыентаў спецыяльнасцях у апошнія дні. Скажам, калі я бачу, што ў мяне 300 балаў, а бягучы прахадны бал ужо 304, значыць, у мяне ёсць час вызначыцца з тым, што рабіць далей.

Рэктар МДЛУ лічыць не зусім правільным закрываць для абітурыентаў статыстыку падачы дакументаў у 15.00 — за тры гадзіны да закрыцця прыёмных камісій.

— Раскажу, што адбываецца ў гэтыя тры гадзіны ў нашым універсітэце. У прыёмнай камісіі сітуацыя максімальна абвастраецца: абітурыенты хвалююцца, нават плачуць, прычым нервуюцца прэтэндэнты не з самымі нізкімі баламі, а з баламі, якія набліжаны да прахаднога. У мяне, напрыклад, 304 балы, а я бачу, што прахадны бал будзе паміж 300 і 310. І што мне рабіць? Прывяду рэальны прыклад: за тры гадзіны да закрыцця прыёмнай камісіі прахадны бал на аддзяленне кітайскай мовы ў нас зменшыўся з 366 да 321, таму што абітурыенты на ўсялякі выпадак забралі свае дакументы і падалі іх на спецыяльнасць па асноўнай замежнай мове, якую яны вывучалі ў школе. А кітайскую мову вырашылі выбраць ужо другой замежнай мовай для вывучэння.

Рэктар лінгвістычнага ўніверсітэта прапанавала таксама прадастаўляць больш падрабязную статыстыку па балах: пакуль што ў табліцах прыводзіцца колькасць абітурыентаў з баламі ў межах 300—310, 320—330, 340—350 і гэтак далей. Але для тых, хто паступае, гэтай інфармацыі недастаткова.

— Такая мера дазволіць зняць ажыятаж і выключыць памылковыя эмацыянальныя рашэнні не ў самых слабых абітурыентаў, а ў тых, хто мае суму балаў, крыху ніжэйшую за прахадны бал, — лічыць Наталля Баранава. — Мы ўжо спрабавалі гэта рабіць, і такое інфармаванне вельмі спадабалася абітурыентам: яны тут жа адзначылі яго перавагі ў электроннай перапісцы з прыёмнай камісіяй.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПРЫГОЖАЯ ЛІЧБА, УЗЯТАЯ З НЕБА




**Пасажырапаток Авіякампаніі «Белавія» ўпершыню ў сваёй гісторыі дасягнуў двух мільёнаў чалавек.**

Двухмільённы пасажыр быў вызначаны на рэгістрацыі рэгулярнага рэйса Амстэрдам — Мінск. Ім стала Вольга Гудцова. Юбілейнаму пасажыру было падрыхтавана свята: у аэрапорце пад мексіканскія матывы музычнага калектыву «Марыячы» дзяўчыну сустракалі прадстаўнікі авіякампаніі і СМІ.

Агульная колькасць перавезеных пасажыраў па выніках гэтага года, як мяркуецца, будзе раўняцца 2 085 000. Летась гэты паказчык склаў 1 973 000. Як адзначылі ў авіякампаніі, першы раз за 19 гадоў працы атрымалася перавесці два мільёны пасажыраў менш чым за год. Прычым сёлета рубеж у мільён быў пройдзены яшчэ ў ліпені. Рост пасажырапатоку стаў магчымым дзякуючы развіццю маршрутнай сеткі, павелічэнню частаты выканання рэйсаў і колькасці транзітных пасажыраў. Паўплывалі таксама пашырэнне парка паветраных суднаў і планамерны пераход на гібрыдную мадэль арганізацыі перавозак: у сярэднім тарыфы на перавозкі за бягучы год былі зніжаны на 20 працэнтаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## КАБ ВЕРЫЛІ Ў СЯБЕ

**За кошт сродкаў гранта будзе створана два дадатковыя часовыя працоўныя месцы для інвалідаў у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Лоеўскага раёна.**

Яго дырэктар Кацярына Валасевіч расказала, што атрымалася перамагчы ў конкурсе мясцовых ініцыятыў у рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізуецца Праграмай развіцця ААН і фінансуецца Еўрасаюзам.

Займацца людзі з абмежаванымі магчымасцямі, адзін з якіх — спінальнік, будуць вытворчасцю сувеніраў, што расказваюць пра мясцовыя славутасці. Такім чынам, як лічаць аўтары праекта, будуць дасягнуты розныя мэты, у тым ліку пазіцыянаванне Лоеўскага краю як турыстычнага рэгіёна.

Для ўвасаблення праекта ў жыццё плануецца навучыць інвалідаў рабоце на камп'ютары ў пэўных праграмах. Займацца гэтай справай будуць у асноўным валанцёры — навучэнцы мясцовага педагагічнага каледжа.

«Важна, — падкрэслівае Кацярына Уладзіміраўна, — каб людзі паверылі ў свае сілы, каб зразумелі, што яны асабіста многага могуць дасягнуць». Не выключана, што ў будучыні такі вопыт дапаможа ім набыць пастаянны заробак.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## У НОВАЙ КРАМЕ — ЗНІЖКІ І АКЦЫІ

**У Ганцавічах урачыста адкрылі новую краму тавараў штодзённага попыту. Яна ўзведзена ў рэкордна кароткія тэрміны — менш чым за паўгода.**

Як расказала карэспандэнту газеты **намеснік старшыні Ганцавіцкага раённага спажывецкага таварыства Алена ШУЛЯКОЎСКАЯ,** магазін пабудавалі ў раёне прыватнай забудовы па просьбах навасёлаў. Яшчэ колькі гадоў таму на месцы дамоў па вуліцы Багдановіча шумелі бярозы з рабінамі, а цяпер вырас амаль што катэджны мікрараён, якому вельмі не хапала магазіна. Людзі не раз звярталіся з гэтай нагоды ў райвыканкам. Таму летась у свае планы спажыўтаварыства ўнесла будаўніцтва аб'екта.

І вось у першых чыслах снежня ўрачыста перарэзалі чырвоную стужачку і віталі першых пакупнікоў. На 92 квадратных метрах размясцілі даволі шырокі асартымент тавараў. А каб прывабіць наведвальнікаў, распрацавалі цэлую сістэму зніжак і акцый. І рыбу, і традыцыйныя навагоднія гарошак з кукурузай, і іншыя тавары сацыяльнай групы ў новым магазіне можна купіць па дэмакратычных цэнах.

Паводле слоў Алены Шулякоўскай, кааператыўны гандаль у 13-тысячных Ганцавічах працуе ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, бо і прадпрымальнікі не спяць у шапку, і гандлёвыя гіганты маюць тут свае аб'екты. Такое становішча спраў вымушае быць гнуткімі і кемлівымі. Названую краму райспажыўтаварыства ўзвяло за свае сродкі, а на наступны год запланавана будаўніцтва аналагічнага аб'екта таксама ў новым мікрараёне горада.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает,**
***что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»***
**22 декабря 2015 года ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи сельскохозяйственному унитарному предприятию «Озерицкий-Агро».
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи открытому акционерному обществу «Туровщина».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 14 декабря 2015 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 14 по 20 декабря 2015 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 20 декабря 2015 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 54 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 59.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

# А З СУСЕДЗЯМІ ЛЕПШ СЯБРАВАЦЬ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Кажуць, што ацэньваюць па сярэднім па горадзе, і ўсё...***

— Не, такое тлумачэнне не задавальняе. Незразумела, што за сярэдняя ацэнка. Ацэнка ажыццяўляецца індывідуальна. Павінен улічвацца і раён аб'екта, і яго цяперашні стан, і шэраг іншых фактараў.

***— Наўзамен сваіх кватэр нам цяпер прапануюць жыллё ў доме 1960-х гадоў па вуліцы Каліноўскага, дзе ў памяшканнях звычайныя стандартныя столі і кухні плошчай да 5 квадратных метраў. Лічым, што гэта не зусім справядліва.***

— Пры прадастаўленні новага жылля плошча кватэр у доме пад знос улічваецца, але яна не павінна быць меншая за адпаведны нарматыў на чалавека. Акрамя таго, у гэтым выпадку бярэцца пад увагу і кошт кватэры, што даецца ўзамен, і той, якая забіраецца пад дзяржаўныя патрэбы. У тым выпадку, калі кошт так званай новай кватэры будзе меншым за кошт аб'екта ў доме пад знос, тады новаму ўласніку павінны заплаціць розніцу. Цяпер вам застаецца толькі сачыць за якасцю праведзенных разлікаў па гэтых коштах.

***— А калі мы не згодны з іх ацэнкай?***

— У гэтым выпадку ўласнікі жылля могуць звярнуцца па правядзенне экспертызы дакладнасці зробленай ацэнкі. Такая працэдура робіцца па дагаворы не бясплатна, але гэта, пры наяўнасці сумненняў, дазваляе пераканацца ў аб'ектыўнасці праведзенай ацэнкі. Калі вынікі экспертызы не будуць супадаць з ацэнкай, тады такое спрэчнае рашэнне магчыма будзе абскардзіць у судзе.

**Любоў Валасоўская, Любанскі раён, пасёлак Сосны-2:**

***— Андрэй Анатольевіч, дапамажыце. У мяне пытанне пра грошы. Чаму нам такі вялікі прапануюць плаціць падатак за нерухомасць? Налічылі ажно 475 тысяч рублёў. А ў нас там толькі адна хата, у якой мы жывём больш за 30 гадоў. У 1990-я гады мы гэты дом прыватызавалі. А муж у мяне пенсіянер. Да гэтага ўсё жыццё адпрацаваў у лясніцтве. Можа, нам нейкая льгота належыць?***

— Па гэтым пытанні вам неабходна звярнуцца пісьмова ў падатковую інспекцыю і ўдакладніць інфармацыю па падаткаабкладанай базе вашай нерухомасці. Трэба, каб вам растлумачылі, якім чынам атрымалася такая вялікая ацэнка дома. Калі пасля гэтага ў вас застануцца пытанні па кошце вашага жылля, тады звяртайцеся да нас, і ў камітэце паспрабуюць дасканала разабрацца па гэтым пытанні.

## Ці будзе садовы домік жылым домам?

**Кацярына Жук, горад Мінск:**

***— Я неаднаразова чула, што дачныя пасёлкі пад Мінскам могуць пераафармляць пад населенныя пункты: напрыклад, яны стануць вёскам або пасёлкамі. Ці праўда гэта, і што такое пераафармленне дасць жыхарам новых вёсак?***

— Па-першае, трэба ўдакладніць, пра дачны пасёлак ці садоўніцкае таварыства ідзе гаворка. Паміж гэтымі структурамі вялікая розніца.

***— Нам зямельны ўчастак давалі для вядзення калектыўнага садоўніцтва.***

— Для таго, каб тэрыторыя садоўніцкага таварыства стала населеным пунктам, неабходна выканаць дастаткова шмат мерапрыемстваў. Так, гэта магчыма, але... Працэдура змены фармату тэрытарыяльнага кіравання магчыма двума шляхамі. На тэрыторыі самога садаўніцкага таварыства можна арганізаваць населены пункт або далучыць плошчу такога таварыства да бліжэйшага населенага пункта (вёскі, аграгарадка, пасёлка).

Але гэта не зусім проста. Папярэдне неабходна меняць межы існуючай вёскі, або, згодна з дзейным заканадаўствам, ствараць новы населены пункт. Рашэнне аб гэтым прымае адпаведны тэрытарыяльны Савет дэпутатаў. Каб падобнае рашэнне было станоўчым, трэба правесці шмат розных мерапрыемстваў. Напрыклад, патрабаванні да садовых домікаў і да інфраструктуры, у тым ліку сацыяльных аб'ектаў таварystваў, істотна адрозніваюцца ад падобных патрабаванняў у населеных пунктах. Нормы заканадаўства па жылых дамах больш жорсткія, чым па лёгкіх садовых доміках. Прыкладна такая сітуацыя існуе і па патрабаваннях да дарог, водазабеспячэння, электрычнасці і іншых аспектаў інфраструктуры.

***— Так. Звычайнаму садаводу такую аперацыю не зрабіць. Атрымліваецца, што для такой рэарганізацыі неабходна ініцыятыва мясцовых Саветаў?***

— Вельмі сумняваюся, што мясцовыя Саветы будуць актыўнічаць на гэты конт. Магчыма, што з падобнай ініцыятывай могуць звяртацца грамадзяне, якія жадаюць аформіць свой дыхтоўны садовы домік у якасці жылога дома. Аднак звычайна ў садоўніцкім таварыстве далёка не ўсе садовыя домікі адпавядаюць крытэрыям капітальнай пабудовы. Увогуле, гэта даволі складанае пытанне, якое павінна вырашацца выключна комплексна, з улікам інтарэсаў розных бакоў і пры выкананні ўсіх дзейных патрабаванняў у сферы горадабудаўніцтва.

## Рэгістраваць нерухомасць стала прасцей

**Аляксандр Іваноў, Мінск:**

***— Андрэй Анатольевіч, днямі чуў, што ў вашай сістэме стала лягчэй рэгістраваць нерухомую маёмасць. Кажуць, што рэгістраваць стала і прасцей, і хутчэй. У мяне ў іншым горадзе застаўся дамок ад дзеда. Якім чынам я яго магу цяпер зарэгістраваць, за які час, і колькі гэта будзе каштаваць?***

— Магчыма зарэгістраваць любы аб'ект нерухомай маёмасці ў дзень звяртання па дзяржаўную рэгістрацыю, калі ўсе неабходныя дакументы былі пададзены кліентам у адпаведнае падраздзяленне рэгістрацыі па месцы прапіскі да 16 гадзін дня. У сувязі з тым, што ваша нерухомасць знаходзіцца ў іншым месцы, то ў вас ёсць магчымасць звярнуцца ў Мінскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі маёмасці па зав. Вайскаваму, 15 або вул. Румянцава, 14. Там арганізуюць перасылку дакументаў у структурнае падраздзяленне, якое будзе ажыццяўляць рэгістрацыю. У гэтым выпадку працэс рэгістрацыі займе крыху больш час, але вам не спатрэбіцца ехаць падаваць заяву па месцы знаходжання дома.

Другое. За здзяйсненне рэгістрацыйных дзеянняў у паскораным парадку (на працягу аднаго дня) бярэцца плата, якая адрозніваецца ад звычайных тарыфаў на 0,1-0,2 базавай велічыні. Стартавая базавая пазіцыя за адно рэгістрацыйнае дзеянне складае 0,5 базавай велічыні. Поўны кошт рэгістрацыі вам падкажуць непасрэдна на месцы.

***— Па зямельным участку дакументы ўжо ёсць, а вось з домам...***

— Калі сам дом не быў зарэгістраваны і трэба рабіць тэхнічную інвентарызацыю, то за выраб тэхпашпарта неабходна будзе заплаціць адпаведную суму дадаткова.

> **«Магчыма зарэгістраваць любы аб'ект нерухомай маёмасці ў дзень звяртання па дзяржаўную рэгістрацыю, калі ўсе неабходныя дакументы былі пададзены кліентам у адпаведнае падраздзяленне рэгістрацыі па месцы прапіскі да 16 гадзін дня».**

***— У мяне існуе пытанне наконт тапаграфічных картаў. У продажы Белкартаграфіі я бачыў карты раёнаў, аўтамабільныя карты гарадоў Беларусі і іншыя. Гэта ўсё добра, але цывілізацыя крочыць наперад. Ці не разглядаецца ў камітэце ідэя стварэння электронных картаў высокай якасці?***

— Цікавае і даволі сур'ёзнае пытанне. Працуем над ім. Абяцаю вам абавязкова разгледзець гэтую прапанову. Дзякуй за ідэю.

**Антаніна Бяляева, г. п. Бараўляны:**

***— Ці сапраўды сёння трэба рэгістраваць зямельныя ўчасткі ў садоўніцкіх таварыствах? Усе нашы суседзі яшчэ летась так хуценька рэгістраваліся...***

— Так, вы сапраўды маеце рацыю. Гэта трэба рабіць. Больш за тое, асабліва гэта тычыцца таго, хто мае нерухомасць у садоўніцкіх таварыствах прыгарадных зон Мінска і абласных цэнтраў. Там цяпер дзейнічае пяцігадовая забарона на рэалізацыю такіх надзелаў з даты іх дзяржаўнай рэгістрацыі. Растлумачу сітуацыю. Магчыма, чалавек атрымаў зямельны ўчастак пад Мінскам нават 10-15 гадоў таму. Ён яго не рэгістраваў. За гэты час пабудаваў там садовы домік і вырашыў яго прадаць. Цяпер гаспадар гэтай нерухомасці можа прадаць такую зямлю (разам з пабудовамі) толькі пасля таго, як зарэгіструе яе, і потым з даты рэгістрацыі пройдзе 5 гадоў.



Працэдура, калі тэрыторыя садоўніцкага таварыства становіцца населеным пунктам, — даволі складаная.

Фота Надзеі БУЖАН.

***— І навошта ўсё так ускладнілі?***

— Гэта зроблена дзеля таго, каб выключыць магчымасць спекуляцый у гэтай сферы, каб не ўзнікала нейкіх шэрых схем перапродажу зямельных участкаў. А такое раней было, бо існуе павышаны попыт на зямельныя ўчасткі вакол буйных гарадоў краіны.

## Прыватнае жыллё фірмы не прыватызуецца

**Аляксандр Сапожнікаў, Мінск:**

***— У мяне такое пытанне. Калі пераафармілі нерухомасць, але не зарэгістравалі яе ў БТІ, то які тэрмін даецца, каб зарэгістраваць? Гэта тычыцца здзелкі дарэння.***

— У гэтым выпадку тэрмін для звяртання ў агенцтва па рэгістрацыі не вызначаны, але трэба разумець, што могуць узнікнуць пэўныя нюансы. Так, толькі з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі гэты дагавор будзе мець юрыдычную сілу. Удакладню. Калі ў гэты перыяд дарыльшчык перадумае або з ім нешта здарыцца, то такі дагавор не ўступае ў сілу. Напрыклад, пры смерці дарыльшчыка ў гэты час дагавор робіцца несапраўдным, а нерухомасць перадаецца па спадчыне.

**Валянціна, Старадарожскі раён, вёска Леўкі:**

***— Муж атрымаў дом ад калгаса, дзе ён працаваў да 2002 года. У свой час мы яго не прыватызавалі, а ў 2004 годзе калгас быў рэарганізаваны ў акцыянернае таварыства. Цяпер мы хочам прыватызаваць гэты дом, але нам адмаўляюць, бо ў складзе ўласнікаў прысутнічае замежны інвестар. Можа, яны нешта блытаюць, бо не ведаюць усіх законаў?***

— Прыватызацыя жылля ажыццяўляецца толькі ў дачыненні да дзяржаўнай уласнасці. Хутчэй за ўсё, цяпер гэты дом з'яўляецца прыватнай уласнасцю таварыства. Таму сёння пытанне ставіцца не аб прыватызацыі, а аб продажы аб'екта нерухомасці. Калі акцыянернае таварыства не жадае прадаваць гэты дом, то ніхто не можа прымусіць яго гэта зрабіць. Вам я параю канкрэтна ўдакладніць, каму ваш дом сапраўды належыць. Магчыма, ён знаходзіцца на балансе мясцовых улад. У гэтым выпадку прыватызацыя ці іншы спосаб адчужэння дазваляецца.

***— Куды мне звяртацца канкрэтна?***

— Наведайце жыллёвы аддзел мясцовага райвыканкама.

## Дапаможа сэрвітут

**Валянцін Кавальчук (канкрэтны адрас сваёй вёскі не назваў):**

***— У мяне праблема з суседзямі. Ад сцяны майго дома да суседскага плота ўсяго 20 сантыметраў. Так здарылася, што мы з суседзямі цяпер не вельмі сябруем. А гэтая мяжа ўпрытык да нашага дома не дазваляе мне рабіць рамонт будынка. Мне здаецца, што ў свой час былі парушаны нормы. Было б добра гэтую памылку цяпер выправіць. Спрабаваў я знайсці справядлівасць на месцы, але нашы чыноўнікі мяне не разумеюць або не жадаюць гэтага рабіць...***

— Я таксама вам не дапамагу, бо гэтае пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі або выканкама, або суда. Ніводзін іншы дзяржаўны орган кіравання ў гэтым выпадку вам не дапаможа.

***— Адкажыце ўсё ж, сёння па законе мне павінны даць пэўны кавалак зямлі каля майго дома (хлява), для яго абслугоўвання (рамонту)?***

— Калі б зямельны ўчастак вы атрымалі сёння ці крыху раней, то пытанняў наконт мяжы ўпрытык не існавала. Але зямельныя ўчасткі вы з суседам атрымлівалі значна раней, калі дзейнічалі іншыя нормы. У вас ёсць права звяртацца ў суд па гэтым пытанні, але не факт, што вы яго выйграеце. Я б вам параіў паставіць пытанне аб прадастаўленні вам сэрвітуту. Наўрад ці выканкам паспрабуе адабраць частку прыватнай зямлі ад аднаго ўласніка, каб перадаць яе другому прыватніку.

***— Слова «сэрвітут» чую першы раз.***

— Гэта права абмежаванага карыстання чужым зямельным участкам. У вашым выпадку невялікі кавалачак зямлі ўчастка суседкі абмяжоўваецца вашым правам некалькі раз на год (або пастаянна) мець доступ да сцяны і даху вашых пабудоў. Аднак увесь участак застаецца ў карыстанні (валоданні), уласнасці суседкі.

**Кар. «Звязды»:**

***— Падобных спрэчных пытанняў сёння ўзнікае шмат?***

— Хапае. Раней было значна больш. Яшчэ раз патлумачу ўсю схему такіх пытанняў. Зямельныя спрэчкі вырашаюцца альбо мясцовым выканкамам, або судом. Калі праблема мяжы зямельных участкаў узнікае ў дачыненні да зямлі, што знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, ці канфлікт звязаны з індывідуальнымі пабудовамі, то ў гэтым выпадку апошнюю кропку па справе ставіць толькі суд.

Калі падобныя спрэчкі разглядае выканкам, тады ствараецца спецыяльная камісія. Гэтая камісія павінна будзе наведаць аб'ект спрэчкі, дзе непасрэдна на месцы будуць разглядацца аргументы абодвух бакоў і прымацца адпаведнае рашэнне. Калі адзін бок канфлікту не згодзен з такім рашэннем, тады такі грамадзянін мае права сваё меркаванне па гэтым пытанні адстойваць у вышэйшай інстанцыі або праз суд. Аднак, калі казаць чыста па-людску, то з любымі суседзямі лепш сябраваць.

## Чэкі «Маёмасць» яшчэ пажывуць

**Таццяна Луцэвіч, горад Мінск:**

***— Ваш камітэт дэлегаваў права абменьваць чэкі «Маёмасць» на акцыі акцыянерных таварystваў Беларусбанка.***

— Так, сёння такія чэкі абменьваюцца праз аддзяленні нашага самага буйнога банка.

***— Я свае чэкі ўжо даўно абменяла на каштоўныя паперы. Днямі ў спадчыну атрымала яшчэ чэкі. Збіралася і іх абмяняць, але сутыкнулася з адной не вельмі зручнай сітуацыяй. Выбар прадпрыемстваў невялікі. Больш за тое, у кожным раёне існуе свой спіс прадпрыемстваў, акцыі якіх прапануюцца ў абмен на чэкі. У нашым аддзяленні ёсць акцыі толькі трох прадпрыемстваў. Чаму спажыўцам нельга прапанаваць на выбар каштоўныя паперы адразу ўсіх акцыянерных таварystваў нават не рэгіёна, а свайго горада?***

— Пытанне слушнае. Існуе шэраг аб'ектыўных абставін, чаму існуе менавіта такі механізм абмену. Цяпер ва ўрадзе разглядаецца пытанне аб падаўжэнні тэрмінаў абмену чэкаў «Маёмасць» на акцыі нашых прадпрыемстваў. Дзякуй вам за пытанне. Будзем над ім працаваць.



Нават такі прыгожы дом у Лошыцкім завулку Мінска можа хуткім часам пайсці пад знос...

**Віктар Шкода, горад Маладзечна:**

***— У мяне пяць гадоў таму памёр бацька. А да гэтага на яго імя была афармлена спадчына — хата дзеда. Долю гэтай спадчыны ад бацькі атрымалі мы з сястрой. Але сярод спадчыннікаў хаты ёсць яшчэ дзве нашы цёткі (родныя сёстры бацькі). Цёткі паміж сабой і з намі таксама сур'ёзна пасварыліся з-за гэтага дома. Зямельны падатак і падатак на нерухомасць плацім мы з сястрой, а цёткі ўсё не могуць разабрацца, хто з іх галоўны. Ці маем мы магчымасць цяпер адмовіцца ад гэтай спадчыны?***

— Ці ўсе спадчыннікі аформілі свае правы на гэты дом?

***— Мы з сястрой аформілі зямельны ўчастак пад гэту хату. А сам дом яшчэ не аформлены, бо ў афармленні яго павінны прысутнічаць усе спадчыннікі.***

— Адмаўляцца ад гэтай спадчыны магчыма было на працягу шасці месяцаў з даты смерці ўласніка. Як зараз выйсці з гэтай сітуацыі? Вам з сястрой трэба аформіць свае долі на гэты дом. Пасля гэтага можна будзе прадаць ці падарыць свае долі цёткам, суседзям, іншым трэцім асобам — любому. Проста адмовіцца ад сваёй долі спадчыны па судзе вам будзе складана.

## Не трапіць на вуду зямельных аферыстаў

**Ірына Мажэйка, горад Мінск:**

***— У мяне двое дзетак: спадзяёмся, што праз пэўны час будзе і трэцяе. А мы з мужам жывём у Мінску ў кватэры бацькоў. Калі ў нас будзе трое дзетак, то ці зможам мы як шматдзетная сям'я разлічваць на атрыманне зямельнага ўчастка для будаўніцтва ўласнага дома ў Мінску ці Мінскай вобласці?***

— Сапраўды, шматдзетным сем'ям зямельныя ўчасткі прадастаўляюцца, калі яны маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У Мінску атрымаць зямлю вам тэарытычна будзе магчыма, але... Гэта адзіны выпадак (для шматдзетных), калі на тэрыторыі Мінска дапускаецца выдзяленне зямельнага ўчастка пад будаўніцтва індывідуальнага жылога дома без правядзення аўкцыёну. Аднак трэба ўлічваць той факт, што на тэрыторыі сталіцы засталася даволі абмежаваная колькасць свабодных зямельных участкаў, прадугледжаных пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Вядома, што ахвотных атрымаць такі зямельны ўчастак менавіта ў Мінску даволі шмат. У чаргу вас сапраўды паставяць, але застанецца адкрытым пытаннем рэальны тэрмін атрымання зямельнага ўчастка.

У Мінскай вобласці атрымаць зямельны ўчастак вам будзе прасцей. Тут трэба спачатку вызначыцца з раёнам і дакладна з сельсаветам, дзе вы жадаеце жыць. На гэты конт існуе пастанова Саўміна №1781, якая вызначае парадак пастаноўкі на гэты ўлік. Пасля таго, як вы там пакінеце сваю заяву, вам застанецца толькі чакаць сваёй чаргі на атрыманне зямельнага ўчастка.

***— А цяпер, калі мы не з'яўляемся шматдзетнай сям'ёй, можам набыць участак толькі на аўкцыёне?***

— У якасці маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў вы можаце і сёння стаць на адпаведны ўлік у Мінскай вобласці (акрамя Мінска) і чакаць прапаноў ад мясцовых улад выбранага вамі раёна.

***— Мужу прапануюць яшчэ адзін варыянт. Набыць на другасным рынку зямельны ўчастак з незавершаным будаўніцтвам. Тут існуюць нейкія «падводныя камяні»?***

— Тут таксама трэба ўлічваць шэраг момантаў. Справа ў тым, што, калі зямельны ўчастак атрымліваўся вашым патэнцыйным прадаўцом у якасці маючага патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то сёння існуе забарона на продаж такіх аб'ектаў на працягу 8 гадоў з даты рэгістрацыі ўжо пабудаванага дома. Таму ў такога грамадзяніна закансерваваны аб'ект вы не выкупіце. Калі зямельны ўчастак набываўся чалавекам на аўкцыёне ці нейкім іншым чынам — не ў якасці жыллёвага чаргавіка, тады падобную «незавершанку» вы набыць можаце. Таму ў гэтай сітуацыі рэкамендую спачатку дакладна разабрацца з тым момантам, на якой падставе гэты ўчастак належыць прадаўцу.

> **«Калі праблема мяжы зямельных участкаў узнікае ў дачыненні да зямлі, што знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, ці канфлікт звязаны з індывідуальнымі пабудовамі, то ў гэтым выпадку апошнюю кропку па справе ставіць толькі суд».**

Калі вам паспрабуюць прапанаваць купіць падобны аб'ект, магчыма, і танней, але без адпаведнага афармлення на ваша імя (паабяцаюць аформіць яго на вас пазней), то шчыра рэкамендую не звязвацца з такімі схемамі. Гэта — афера.

***— Удакладніце па незавершаным будаўніцтве адзін момант. Ці існуе канкрэтны тэрмін, калі гэты дом пасля кансервацыі мы павінны дабудаваць?***

— Згодна з нормамі Указа Прэзідэнта №87 каробка дома (фундамент, сцены і дах) павінна быць узведзена на працягу трох гадоў з даты рэгістрацыі права на зямельны ўчастак. Атрымліваецца, што калі жыллёвы аб'ект ужо будаваўся 1,5 года, а потым быў закансерваваны, то вам застаецца яшчэ 1,5 года на яго ўзвядзенне. Гэты тэрмін магчыма падоўжыць у выпадку цяжкага матэрыяльнага становішча ці іншых уважлівых прычын. Мясцовы выканкам можа дазволіць дабудоўваць гэты дом да двух гадоў. Гэта тычыцца будаўніцтва менавіта каробкі. Унутранае адстройванне жылых памяшканняў і іншыя работы па інфраструктуры нейкімі дакладнымі тэрмінамі не абмяжоўваюцца.

## А за зямлю даплаці

**Кар. «Звязды»:**

***— Хачу ўдакладніць пэўныя моманты наконт забароны на продаж жылых аб'ектаў на працягу 8 гадоў з даты рэгістрацыі ўжо пабудаванага дома, калі зямельны ўчастак пад ім быў прадастаўлены грамадзяніну па чарзе. Сёння такая забарона ўжо не такая жорсткая?***

— Так. З улікам складаных жыллёвых сітуацый (нехта памёр, атрымаў інваліднасць, уласнік жылля пераведзены на працу (службу) у іншую мясцовасць), калі па аб'ектыўных абставінах чалавек не можа дабудаваць аб'ект, то ў гэтым выпадку ўласніку дазваляецца прадаць сваю нерухомасць. У першую чаргу такі аб'ект прапануецца купіць выканкаму, а калі ў выканкама няма такой магчымасці — дазволіць прадаваць на свабодным рынку. Тут існуе яшчэ адзін нюанс.

Калі зямля выдзялялася чаргавіку па льготнай цане, то пры такім тэрміновым продажы гаспадар нерухомасці павінен даплаціць за зямельны ўчастак да поўнага яе кадастравага кошту. Калі зямля давалася кліенту ў пажыццёвае валоданне без аплаты, то цяпер гаспадар аб'екта павінен цалкам выкупіць участак па кадастравым кошце або аформіць арэнду на 99 гадоў, за што таксама трэба заплаціць.

Гэта зроблена дзеля таго, каб нейкімі хітрыкамі не ажыццяўляўся «шэры» продаж зямлі.

## Уласны кантроль за якасцю

**Васіль Іваноў, горад Заслаўе:**

***— Ці існуе ў структуры вашага камітэта спецыяльная служба ўласнай бяспекі, якая сочыць за магчымымі памылкамі?***

— Ва ўсіх арганізацыях, якія працуюць з насельніцтвам і з юрыдычнымі асобамі (аказваюць паслугі, выконваюць работы), створаны службы кантролю за якасцю. Спецыялісты гэтай структуры праглядаюць дакументы, якія выдаюцца кліентам. Гэта комплексная сістэма, калі кожны дакумент аналізуецца (акрамя выканаўца) кіраўніком аддзела. Акрамя таго, цалкам пакет дакументаў разглядаецца службай сістэмы якасцю ўнутры прадпрыемства. Такая сістэма якасці развіваецца і ў тэхналагічным напрамку. Выкарыстоўваюцца аўтаматызаваныя сістэмы кантролю якасці з праграмным забеспячэннем. У тых месцах прыёму грамадзян, дзе з'яўляецца сапраўды шмат заяў, устаноўлены сістэмы аўдыя- і відэазапісу. Апошняе дысцыплінуе не толькі работнікаў, але і спажыўцоў.

А ўсё гэта даволі істотна памяншае выхад дакументаў з памылкамі на рукі да кліентаў.

**Кар. «Звязды»:**

***— Чуў, што сёлета ваш камітэт падняўся яшчэ на адну прыступку па лініі падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Што новага было зроблена?***

— Так. Напрыканцы лістапада быў адкрыты філіял кафедры геадэзіі і картаграфіі геаграфічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, прыкладной геадэзіі І фотаграмметрыі, геадэзіі і кадастраў геадэзічнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама спецыяльны навучальны камп'ютарны клас.

Аб'ядноае навучальную прастору прадпрыемства «Белгеадэзія» Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі.

Адзначу, што філіял кафедраў дзвюх вядучых навучальных устаноў краіны створаны ў мэтах павышэння ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасцях «Космааэракартаграфія», «Геадэзія» і «Геаграфія (геаінфармацыйныя сістэмы)», у тым ліку забеспячэння вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практык студэнтаў, выканання курсавых І дыпломных праектаў, магістарскіх, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па напрамках асноўнай дзейнасці прадпрыемстваў Дзяржкаммаёмасці. Новаўвядзенне будзе спрыяць лепшай адаптацыі студэнтаў у працэсе навучання да канкрэтных вытворчых умоў, атрыманню імі навыкаў працы ў працоўных калектывах па напрамках картографа-геадэзічнай дзейнасці.

> **«Пры прадастаўленні новага жылля плошча кватэр у доме пад знос улічваецца, але яна не павінна быць меншая за адпаведны нарматыў на чалавека».**

Гэта ўжо не першая навучальная база для ВНУ, створаная па ініцыятыве і сіламі Дзяржкаммаёмасці. У 2013 годзе для інтэграцыі праектнай і навуковай дзейнасці і вышэйшай адукацыі, узмацнення практычнай накіраванасці падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасцях «Геаінфармацыйныя сістэмы», «Космааэракартаграфія», «Геаграфія» на базе праектнага інстытута «Белгіпразем» быў створаны філіял кафедры глебазнаўства і зямельна-інфармацыйных сістэм геаграфічнага факультэта БДУ. У тым жа годзе на базе праектных інстытутаў «Белгіпразем» і «Магілёўгіпразем» былі адкрыты філіялы кафедры землеўпарадкавання БДСГА.

Сёлета ў маі, да 90-годдзя стварэння землеўпарадкавальнага факультэта Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, за кошт спонсарскай дапамогі арганізацый па землеўпарадкаванні сістэмы УП «Праектны інстытут Белгіпразем» у БДСГА была адрамантавана вучэбная аўдыторыя, у якой размесціцца камп'ютарны клас для ўкаранення ў навучальны працэс самых сучасных інавацыйных тэхналогій.

У цэлым у галіне вядзецца мэтанакіраваная праца, накіраваная на ўдасканаленне падрыхтоўкі спецыялістаў для профільных арганізацый, сумесна з Дзяржкаммаёмасцю ў БДСГА вызначаецца неабходны пералік і аб'ём навучальных дысцыплін і практык.

Напрыклад, выпускнікі землеўпарадкавальнага факультэта ўжо з 3-га курса акадэміі (з моманту праходжання першых вытворчых практык на прадпрыемствах і ў арганізацыях) знаёмыя з будучымі працадаўцамі. Сёлета 66 з 74 маладых спецыялістаў былі працаўладкаваны ў сістэме Дзяржкаммаёмасці і землеўпарадкавальных службах.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

алімпіец
ЗВЯЗДА ВЫПУСК № 9 (37)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



# НАША «ФАБРЫКА ЗОРАК»

## У Мінску прайшоў традыцыйны міжнародны турнір па мастацкай гімнастыцы

**Сталічны Палац спорту на некалькі дзён стаў домам для грацый. Там адбыўся 14-ы міжнародны турнір «Дынама» на прызы алімпійскай чэмпіёнкі Марыны Лобач. У спаборніцтвах прынялі ўдзел спартсменкі з 15 краін, у іх ліку тры дэбютанткі турніру — каманды Кыргызстана, Кіпра і Паўднёвай Карэі.**



Камплекты ўзнагарод разыграны ў чатырох узроставых групах. У наймалодшай з іх у практыкаваннях без прадмета выступілі ўдзельніцы да 2007 года нараджэння. У найстарэйшай узроставай катэгорыі за галоўны прыз спаборніцтваў (імянную статуэтку Марыны Лобач) змагаліся юніёркі 2001-2002 гадоў нараджэння. Нашу краіну прадставілі 42 спартсменкі.

*— Мы выставілі свой наймацнейшы склад, таму што гэтыя спаборніцтвы з'яўляюцца адным з этапаў адбору да юніёрскага чэмпіянату Еўропы, які пройдзе ў наступным годзе ў Ізраілі,* — адзначыла **галоўны трэнер нацыянальнай каманды Беларусі Ірына ЛЯПАРСКАЯ.**

Ужо па традыцыі на хатнім турніры нашы юныя грацыі выступілі добра, толькі ў найстарэйшай катэгорыі гімнастак (2001-2002) імянныя статуэткі Марыны Лобач дасталіся прадстаўніцы Украіны Юліі Ісачанцы. У іншых узростах дамінавалі беларускі, якія выйгралі 8 фіналаў з 10.

Спаборніцтвы на прызы Марыны Лобач ўжо даўно сталі сапраўднай «фабрыкай зорак» для айчынных гімнастак. З гэтага турніру выраслі такія вядомыя спартсменкі, як Валерыя Курыльская, Аляксандра Наркевіч, Ганна Рабцава і Меліціна Станюта.

— Я калісьці была такой жа маленькай дзяўчынкай, як дзеці, якія выступаюць на нашым турніры. Аднойчы ў мой родны горад Смалявічы прыехаў выдатны чалавек — Ірына Юр'еўна Ляпарская — і паказала мне, што такое мастацкая гімнастыка, распавяла, навучыла любіць. Крок за крокам, спаборніцтва за спаборніцтвамі я разумела, што мастацкая гімнастыка — гэта ўсё, што ў мяне ёсць, і ўсё, што я ўмею рабіць. Я стала алімпійскай чэмпіёнкай, трэнерам, але ўсё пачалося тады, далёка, у юным узросце. Таму я хачу пажадаць усім дзецям, усім, хто займаецца спортам, заўсёды думаць пра сваіх трэнераў, любіць іх, таму што яны, як бацькі дома, самыя вялікія людзі, — такое настаўленне дала спартсменкам **Марына ЛОБАЧ, ідэйны натхняльнік і галоўны суддзя турніру.**

Для юных гімнастак на турніры таксама былі прадугледжаны спецыяльныя ўзнагароды ў намінацыях: «Прыз глядацкіх сімпатый», «Усмешка», «Элегантнасць», «Натхненне», «Надзея», «За волю да перамогі», «Арыгінальнасць» і «Міс турніру».




Тэрыторыя КХЛ

# НА ШЛЯХУ ДА ПЛЭЙ-ОФ

## Экватар сезона Кантынентальнай хакейнай лігі ўжо пройдзены



**За гэты час у выступленнях мінскага «Дынама» здараліся як гучныя перамогі, так і зусім не патрэбныя паражэнні. Цяпер наша каманда знаходзіцца ў зоне плэй-оф і захоўвае за сабой восьмы радок у заходняй канферэнцыі. Пра тое, як праявіў сябе беларускі клуб у першай палове сезона і ў якіх кампанентах варта дабавіць «зубрам», каб працягнуць барацьбу ў плэй-оф, мы пагаварылі з начальнікам скаўцкага агенцкага сектара Федэрацыі хакея Беларусі Уладзіславам КЛАЧКОВЫМ.**

### ПРА ВЫНІКІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ

— Хацелася б, вядома, каб вынік быў лепшым, але з улікам усіх падзей, якія адбываліся ў камандзе, і такое прамежкавае становішча выглядае добра. На мой погляд, каманда заслугоўвае ацэнку, вышэйшую за сярэднюю.

У першую чаргу гульню «Дынама» падкасілі траўмы вядучых гульцоў. Пашкоджанні пераследуюць лідараў каманды з самага пачатку сезона. Было выразна відаць, што калі выбывае адзін гулец, то трэнерам вельмі цяжка знайсці яму раўнацэнную замену, таму перыядычна ўзнікалі «прабуксоўкі». У прыватнасці возьмем тройку Веске—Элісан—Лінгле — гэта звязка, якая рабіла вынік; хакеісты даўно ведаюць адзін аднаго і, вядома, выдатна разумеюць. Але раптам выбыў Лінгле, і іншыя спалучэнні, якія спрабавалі прыдумаць трэнеры, аказаліся ўжо не такімі выніковымі.

Калі разбіраць гульню «Дынама» па пазіцыях, то па абаронцах, безумоўна, пытанняў менш, чым па нападаючых. Яны роўна гуляюць па ходзе чэмпіянату; вядома, ёсць спады ў асобных гульцоў, але гэта адна-дзве гульні. Агульная адзнака абарончай лініі — здавальняючая.

Варатарская пазіцыя ў прынцыпе ў нас закрыта таксама нядрэнна, тры раўнацэнныя галкіперы, якія могуць адзін аднаго замяняць. Яны сваю працу робяць, да іх асаблівых прэтэнзій няма. А вось нападзенню можна было б, вядома, дадаць. У першую чаргу гэта датычыцца рэалізацыі большасці. Летась гэты кампанент быў «каньком» «Дынама». У сучасным хакеі рэалізацыя лішняга гульца мае вялікае значэнне і моцна ўплывае на вынік. Часам, калі каманда забівае 1-2 галы з гульні, гэтага не дастаткова для перамогі.

### ПРА ТРЭНЕРСКІ ШТАБ

— На мой погляд, Кавалёў на сённяшні момант спраўляецца са сваёй працай. Андрэй Робертавіч быў у трэнерскім штабе, але ўсе павінны разумець, што адно — гэта быць асістэнтам галоўнага трэнера, і зусім іншае — кіраваць камандай. Адказнасць ляжыць на табе і за вынік, і за ачкі. З Кавалёвым я яшчэ гуляў у хакей, таму добра ведаю яго. Андрэй Робертавіч — справядлівы лаяльны чалавек і граматны спецыяліст, ён прафесійна ставіцца да ўсяго. Магчыма, у нейкіх момантах яму не хапае лаяльнасці, прыбаў ён яе, быў бы плюс і для яго, і для каманды.

Адзначу, што ўсе тыя скандалы, якія былі ў клубе ў пачатку сезона, звязаныя з кіраўніцтвам, ніяк не павінны паўплываць на гульню хакеістаў. У такой камандзе павінны быць толькі прафесіяналы, гулец падпісвае кантракт і павінен паказваць вынік, а хто кіруе арганізацыяй, не важна.

У «Дынама» ёсць два фарм-клубы: у Бабруйску і Маладзечне. Асабіста я прыхільнік таго, каб у такім узросце гуляць у другой камандзе, але атрымліваць па 20 хвілін гульнявога часу ў матчы, чым сядзець на лаўцы ў КХЛ. Усё ж майстэрства прыходзіць менавіта ў працэсе гульні.

Сёння пад брэндам «Дынама» выступаюць і іншыя маладзёжныя каманды, U-20 базіруецца ў Бабруйску і выступае ў экстралізе, хлопцы з U-18 гуляюць у МХЛ, хакеісты з U-17 гуляюць у вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі. Усюды ёсць нядрэнныя хлопцы, якія ў будучыні папоўняць шэрагі асноўнай каманды і нацыянальнай зборнай.

### ЛІМІТ НА ЛЕГІЯНЕРАЎ

— Гэта ўдар у спіну беларусам ад КХЛ, які, безумоўна, пашкодзіць зборнай краіны. Калі б усе ведалі, што складзецца такая сітуацыя, то ў «Дынама», думаю, знайшлі б сродкі, каб падпісаць больш сваіх хакеістаў.

Я наогул лічу, што трэба вызначыць, якія мэты мы праследуем. Калі гэта папулярызацыя хакея, то трэба браць 2-3 зорныя моцныя легіянеры, а не 5-7. На «зорак» будзе хадзіць народ, плюс той чалавек, які рэальна будзе ў камандзе аўтарытэтам і вакол яго тыя ж беларускія хлопцы будуць расці, нешта браць, вучыцца. Гэта і захавае бюджэт клуба, і вызваліць месцы для нашых хакеістаў.




### КАБ ТРАПІЦЬ У ПЛЭЙ-ОФ...

— ...Перш за ўсё трэба мяняць сітуацыю з рэалізацыяй большасці. Я ўпэўнены, што хлопцы разам з трэнерскім штабам адпрацоўваюць усе магчымыя варыянты розыгрышу, і гэта рана ці позна павінна прынесці вынік. Упэўнены, што мы павінны зачапіцца за 8-ку і трапіць у плэй-оф, а там без розніцы, з якога месца ты зайшоў, таму што пачынаецца зусім іншы турнір, іншы хакей. Шмат прыкладаў, калі каманда, якая ледзь трапляла ў накаўт-раўнд, потым праходзіла нават да паўфіналу.

### ПРА МАЛАДЫХ БЕЛАРУСАЎ

— Сёння ў клубе ёсць добрыя перспектыўныя хлопцы, прыклад — Буйніцкі, Знахарэнка, яны атрымліваюць няшмат гульнявога часу, але ім не трэба хвалявацца; іх момант яшчэ прыйдзе.

### ПРА ІНШЫЯ КАМАНДЫ КХЛ

— Са старту яўна вылучаўся ЦСКА — каманда, якая магла і можа гуляць у любы хакей, пры тым не асобныя нейкія звёны, а абсалютна ўсе хакеісты. Цяпер відавочна набраў абароты «Лакаматыў», прыбаўляе маскоўскае «Дынама», добра паказвае сябе «Сібір». Пасля Новага года карціна стане больш зразумелай і дакладна вызначацца фаварыты.

Навіны з Рыа

## НА АЛІМПІЯДУ — БЕЗ ВІЗЫ

**Прэзідэнт Бразіліі Дылма Русеф падпісала законапраект, які дазваляе замежным грамадзянам знаходжанне на тэрыторыі краіны без віз у перыяд правядзення Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў 2016 года.**

Нагадаем, што ў пачатку кастрычніка падпісаны законапраект падтрымалі дэпутаты ніжняй палаты парламента Бразіліі, а пазней ён быў ухвалены Верхняй палатай парламента — Федэральным сенатам.

Згодна з дакументам, скарыстацца такім правам змогуць турысты, якія ўязджаюць у Бразілію з чэрвеня па верасень 2016 года тэрмінам да 90 дзён.

XXXI летнія Алімпійскія гульні — першыя ў Паўднёвай Амерыцы — пройдуць з 5 па 21 жніўня 2016 года.

## ПАДРЫХТОЎКА ВЫХОДЗІЦЬ НА ФІНІШ

**Улады Рыа-дэ-Жанейра кожны месяц даюць справаздачу аб гатоўнасці аб'ектаў, якія прымуць Алімпійскія гульні 2016 года.**

Як запэўніваюць адказныя за ўзвядзенне спартыўных арэн, гатоўнасць аб'ектаў у алімпійскім парку «Бара», які стане цэнтрам будучых Гульняў, у сярэднім складае 94%, а ў кластары «Дэадора» — 93%. У канцы лістапада завершана будаўніцтва трох аб'ектаў — гандбольнай арэны «Future Arena», каноэ-слаламнай трасы і палёў для гольфа. Наступным этапам стане стварэнне неабходнай інфраструктуры, падвядзенне ўсіх камунікацый і тэхнічнае абсталяванне.

## МАК НАЗІРАЕ ЗА ПАЛІТЫКАЙ У БРАЗІЛІІ

**Міжнародны алімпійскі камітэт сочыць за сітуацыяй з працэдурай імпічменту Прэзідэнта Бразіліі Дылмы Русеф, але арганізацыі Алімпійскіх гульняў 2016 года ў Рыа-дэ-Жанейра гэта не тычыцца. Пра гэта заявіў прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах.**

На мінулым тыдні ніжняя палата бразільскага парламента сфармавала спецыяльную камісію для разгляду пытання імпічменту, прычым большасць у ёй атрымалі праціўнікі Русеф. Далей пытанне павінна быць разгледжана на пасяджэнні ўсёй ніжняй палаты і ў сенаце Бразіліі.

«Кантракт (падпісаны) з горадам і будаўнічай кампаніяй, у нас там для поўнай упэўненасці кантакт з мэрам. Мы паважаем прэзумпцыю невінаватасці. Што тычыцца імпічменту Дылмы, то мы назіраем за сітуацыяй... Гэта палітычныя рэчы, якія мала ўплываюць на арганізацыю Гульняў. Мы бачылі цудоўны прагрэс, які быў дасягнуты і працягваецца. І гэта дае нам упэўненасць у поспеху Гульняў», — сказаў Томас Бах.

Нагадаем, апазіцыйныя палітычныя партыі Бразіліі ў верасні прадставілі ў кангрэс патрабаванне адстаўкі Русеф і запуску супраць яе расследавання па падазрэнні ў дачыненні да парушэнняў падатковага заканадаўства і выкарыстанні дзяржсродкаў для фінансавання свайго перавыбрання ў 2014 годзе.

У кастрычніку Русеф заявіла, што не саступіць пад націскам палітычных апанентаў, якія дамагаюцца яе датэрміновага сыходу з найвышэйшага дзяржаўнага паста, прыводзячы «абсалютна штучныя аргументы» і ведучы «бессаромную гульню».

## Лінейны гандбольнага СКА і зборнай краіны аб тым, чаму 99% яго жыцця — гэта спорт

## Арцём КАРАЛЁК:

# «Я НЕ ЎМЕЮ І НЕ ЛЮБЛЮ ПРАЙГРАВАЦЬ»

**Журналісты сёння ўносяць яго ў спісы самых перспектыўных гандбалістаў Беларусі і самых паспяховых маладых спартсменаў краіны. А ён спакойна разважае на тэму свайго поспеху і кажа, што гэта зусім не выпадковасць, а мэтанакіраваная праца. Ураджэнец Гродна Арцём Каралёк пачаў сваю прафесійную кар'еру ў мясцовым «Кронане», але хутка перабраўся ў мінскі СКА. Цяпер ён ужо з'яўляецца адным з лідараў сталічнага клуба і гульцом нацыянальнай зборнай Беларусі. Пра сябе, свае мэты і ўзровень гандбола ў краіне Арцём расказаў карэспандэнту «Звязды».**

***— Пачнём з твайго пераезду ў сталіцу. Як паступіла прапанова ад СКА?***

— Першы раз прапанову пераехаць у Мінск мне агучылі яшчэ ў 2013 годзе, але тады, падумаўшы і параіўшыся з некаторымі людзьмі, я вырашыў застацца ў Гродне. Ведаў, што прабіцца ў асноўны склад СКА будзе вельмі складана, а гуляць за другую каманду я не хацеў, бо ў «Кронане» шмат часу праводзіў на пляцоўцы ў аснове. Цяпер ужо з упэўненасцю можна сказаць, што, зрабіўшы так, тады не пралічыўся. А ўлетку 2014-га функцыянеры СКА зноў выйшлі на мяне з паўторнай прапановай і я адразу пагадзіўся. Былі нейкія рознагалоссі паміж гродзенскім і мінскім кіраўніцтвам клубаў, але літаральна за тыдзень усё вырашылася. Я быў рады апынуцца ў такой камандзе, як СКА, гэта было маёй мэтай, і я планамерна да яе ішоў.

***— Ужо неўзабаве пасля пераезду ў сталіцу ты гуляў за нацыянальную зборную краіны.***

— Яшчэ калі выступаў у Гродне, Шаўцоў выклікаў мяне на зборы ў складзе той моладзі, з якой працаваў. А калі замацаваўся ў аснове армейцаў, паехаў яшчэ раз і хутка дэбютаваў у складзе нацыянальнай каманды.

***— Дэбют атрымаўся?***

— Так! Ён прыпаў на адборачны матч Еўра-2016 з датчанамі *(у гэтай гульні Арцём Каралёк набраў 6 ачкоў і атрымаў званне найлепшага гандбаліста сустрэчы —* **заўвага аўтара***)*. Пасля гульні мяне разам з Юрыем Анатольевічам Шаўцовым запрасілі на прэс-канферэнцыю, і хтосьці з журналістаў запытаўся: ці падобна гэта на казку ці сон? Але як гэта можа быць для мяне сном? Хіба можа чалавек, які ніколі ў зборнай не гуляў, проста так выйсці і забіць 6 мячоў такой камандзе, як Данія? Гэта велізарная праца, якую я прарабіў да 19 гадоў. Само сабой у мяне нічога не з'явілася — ні сіла, ні ўменне.

***— У зборнай ты гуляў побач з найлепшым гандбалістам Беларусі Сяргеем Рутэнкам. Як складвалася ваша праца?***

— На першых зборах з нацыянальнай камандай усе гульцы, якія выступаюць за беларускія клубы, мяне, у прынцыпе, ведалі, былі, вядома, жарты, як заўсёды, калі прыходзіць малады гулец. Сяргей Рутэнка прыехаў дні за тры да гульні і сказаў мне: «Я чуў пра цябе, можна з табой пагуляць?» Ён выдатны чалавек, з добрым пачуццём гумару, сапраўдны лідар, капітан. У яго велізарны вопыт за плячыма, таму ён шмат мне падказваў і я рады гэтаму, стараўся слухаць парады і рабіць так. Я лічу, у нас атрымалася добрая гульня, мы адзін аднаго разумелі, таму гуляць з ім мне было вельмі проста.

**Манера гульні ў мяне дзёрзкая, але ў жыцці я іншы, заўсёды гатовы дапамагчы людзям.**

***— Твой прафесійны рост прыпаў на час, калі настаўнікамі з'яўляюцца такія майстры, як Шаўцоў, Міcontainsановіч, Каршакевіч. Можна сказаць, што табе пашанцавала?***

— Кожны марыць трапіць у СКА ў першую чаргу з прычыны таго, што там працуюць трэнеры, якія рыхтуюць высакакласных гульцоў. Я дадаў бы да гэтага спісу яшчэ Ігара Мікалаевіча Папругу: ён шмат для мяне робіць, не толькі ў рамках агульнакаманднай працы, але і індывідуальна, часта мне падказвае важныя рэчы. У кожнага з гэтых спецыялістаў свая спецыфіка працы. Шаўцоў — трэнер зборнай, ён павінен паставіць гульню каманды ўжо пасля таго, як са мной папрацаваў Міраговіч. Гэта трэнеры, у кожнага з якіх свая школа, але ў той жа час яны ўзаемазвязаны і разам даюць добры вынік. Юрый Анатольевіч шмат працуе з моладдзю і без сумненняў дае нешта сваё. Галоўнае — атрымліваць



усю гэтую інфармацыю ад спецыялістаў, якія з намі працуюць, і потым выкарыстоўваць яе ў гульні.

***— На пляцоўцы ты відавочна праяўляеш лідарскія якасці, а ў раздзявалцы?***

— У кожнай камандзе ёсць гулец, які вядзе за сабой калектыў, які здольны падтрымаць маральна, настроіць. У гэтым сэнсе я нічога не магу сказаць пра сябе, усё ж патрэбен погляд збоку. Для мяне такія людзі — гэта Саша Бачко і Ваня Броўка. Ваня, наогул, чалавек характарны, кумір мільёнаў, для мяне яго словы шмат значаць.

***— Поспехі ў спорце, падобныя да тваіх, могуць закружыць галаву?***

— Так, думаю, яны могуць закружыць галаву кожнаму, таму што не атрымаецца не звяртаць на іх увагу, тым больш калі табе пастаянна пра гэта кажуць. Пасля гульні з Даніяй Каршакевіч зайшоў у раздзявалку і сказаў: «Выключыце святло, тут і так зорка ззяе!» Але гэта ўсё жарты, я не лічу сябе «зоркай» і думаю, што мае поспехі ў спорце не ўплываюць на чалавечыя якасці. Пра мяне кажуць — гэта прыемна, і ад гэтага мне хочацца працаваць яшчэ больш.

***— У адным з інтэрв'ю ты сказаў, што 99% твайго жыцця — гэта гандбол...***

— Так, таму што сюды ўваходзіць і харчаванне, і сон, пасля трэніровак застаюцца лічаныя гадзіны на адпачынак, які таксама можна ўключыць у гэтыя працэнты, бо калі я не адпачну вечарам, то буду не ў той форме раніцай на трэніроўцы. Гэта ўсё настолькі ўзаемазвязана! А пакінуты адзін працэнт — гэта нейкія справы, не звязаныя са спортам, але асаблівых захапленняў у мяне няма. Крыжыкам я не вышываю і шапкі не вяжу. Магу паглядзець што-небудзь са спартыўных тэлетрансляцый, напрыклад хакей, хварэю за родны «Нёман» і «Дынама».

***— Якія якасці характару дапамагаюць табе дамагацца добрых вынікаў?***

— Напэўна, настойлівасць. Да таго ж я не ўмею і не люблю прайграваць. Нават звычайная трэніроўка для мяне — гэта міні-гульня, дзе я павінен перамагчы. Калі заканчваецца трэніроўка, усе — мае сябры і выдатныя партнёры, але падчас працы мы сапернікі. У мяне такі характар, я павінен чым заўгодна дастаць апанента, дагнаць яго, але не саступіць. А гульня — гэта наогул асобная тэма, на гэты час у мяне адключаецца галава, і я проста раблю ўсё, што магу і ўмею. Манера гульні ў мяне дзёрзкая, але ў жыцці я іншы, заўсёды гатовы дапамагчы людзям, нават калі гэта будзе не на карысць маім інтарэсам. Часам у гульнявых момантах у мяне нешта не атрымліваецца, і тады ўключаецца грубасць, вось гэта я хацеў бы прыбраць са свайго характару. У нас жорсткі спорт, але мне трэба навучыцца кантраляваць свае эмоцыі і не пераходзіць устаноўленыя межы.



***— Што можаш сказаць наконт узроўню гандбола ў Беларусі?***

— Я лічу, у нас не дастаткова моцны ўнутраны чэмпіянат, рэдка бываюць напружаныя гульні. Але калі скласці рукі, то што рабіць далей і як перамагаць у міжнародных гульнях? Перад матчам у адказ з «Хардам» у мяне спыталіся пра матывацыю, бо ў чэмпіянаце Беларусі СКА выйграе па 10 мячоў, тое ж і ў Балтыйскай лізе. Але гэта і ёсць матывацыя — расці, удзельнічаць у прэстыжных турнірах, павышаць сваё майстэрства.

Мы выдатна разумелі, што калі не выйдзем у групу Кубка ЕГФ, то сезон зноў будзе вельмі нізкім у плане якасці нашай падрыхтоўкі. Каб атрымаць сур'ёзную гульнявую практыку, нам давялося б чакаць да мая, да гульняў з Брэстам. І зноў жа невядома, у якім стане мы падышлі б да гэтых паядынкаў. Цяпер у нас ёсць шанц падрыхтавацца да групы і выйсці з яе — гэта наша асноўная задача сёння.

***— А што тычыцца нізкай цікавасці гледачоў?***

— Так, на гандбол ходзіць не шмат людзей, але асабіста я не магу сказаць, што гэта неяк уплывае на маю гульню. Вядома, прыемна, калі поўныя трыбуны, калі за цябе хварэюць. У Наваполацку або Магілёве, напрыклад, на гульнях чэмпіянату 20 гледачоў, але я ж не магу сказаць сабе: «Не гуляй!» Калі я — прафесіянал, то павінен выходзіць і рабіць сваю працу ў любой сітуацыі. Зараз, калі мы выйшлі ў групу ЕГФ, спадзяюся, людзі будуць хадзіць на гандбол, прытым гуляць мы будзем на новай арэне. Магчыма, заўзятарам будзе цікава паглядзець, чым і дзе жыве каманда.

***— Узгадай самае крыўднае паражэнне і яркую перамогу.***

— Два самыя прыкрыя паражэнні — гэта майскія гульні з Брэстам: мы маглі гарантаваць сабе лігачэмпіёнскі год, але, на жаль, прайгралі БГК імя Мяшкова ў Кубку краіны і чэмпіянаце Беларусі. А што тычыцца перамог, то кожная з іх мне па-свойму важная. Той жа маладзёжны чэмпіянат свету ў Бразіліі, там было шмат годных вікторый. Мне здаецца, што я памятаю кожную гульню і кожны матч пакідае свой адбітак.

***— Якая ў цябе мэта?***

— У будучыні з'ехаць у клуб, які выступае ў моцным чэмпіянаце, і там нешта з ім выйграць, бо чым большага мы дасягаем, тым больш вялікія мэты ставім перад сабой. Разам з СКА на сёння мая задача — выйсці з групы, са зборнай — выйсці ў плэй-оф на чэмпіянаце Еўропы. У абодвух турнірах шанцы 50 на 50, які б ні быў сапернік.

### Да тэмы:

**Да галоўнага старту сезона — мужчынскага чэмпіянату Еўропы — 2016 — застаўся месяц. Кантынентальнае першынство з 15 па 31 студзеня прыме Польшча, зборная Беларусі на папярэднім этапе згуляе ў Катавіцы са зборнымі Харватыі, Ісландыі і Нарвегіі.**

Трэнерскі штаб на чале з Юрыем Шаўцовым запрасіў на вучэбна-трэніровачны збор 18 гандбалістаў:

Варатары — Віталь Чарапенька (1984, БГК імя Мяшкова), Вячаслаў Салдаценка (1994, СКА-Мінск), Уладзімір Корсак (1996, БГК імя Мяшкова)

Левыя крайнія — Іван Броўка (1980, СКА-Мінск), Андрэй Юрынок (1996, СКА-Мінск), Аляксандр Цітоў (1986, Машэка)

Правыя крайнія — Максім Баранаў (1988, БГК імя Мяшкова), Аляксандр Пацыкайлік (1990, СКА-Мінск)

Лінейныя — Арцём Каралёк (1996, СКА-Мінск), Вячаслаў Бохан (1996, СКА-Мінск), Максім Бабічаў (1986, БГК імя Мяшкова)

Левыя паўсярэднія — Аляксей Шынкель (1994, СКА-Мінск), Уладзіслаў Кулеш (1996, СКА-Мінск), Аляксей Хадкевіч (1994, СКА-Мінск)

Правыя паўсярэднія — Сяргей Шыловіч (1986, БГК імя Мяшкова), Артур Карвацкі (1996, СКА-Мінск), Алег Астрашапкін (1992, Ваці, Венгрыя)

Разыгрываючы — Дзмітрый Нікуленкаў (1984, БГК імя Мяшкова).

21 снежня да каманды далучыцца яшчэ некалькі гульцоў, якія выступаюць за мяжой. 25 снежня наша дружына адправіцца ў Рыгу на традыцыйны міжнародны турнір «Riga Council Cup», дзе памераецца сіламі з камандамі Егіпта, Латвіі і Расіі.

Пасля непрацяглай навагодняй паўзы з 2 студзеня зборная Беларусі зноў збярэцца ў «Стайках». 7 студзеня запланаваны выезд у Маскву, дзе адбудзецца Калядны турнір чатырох каманд. Акрамя гаспадароў, наша каманда згуляе са зборнымі Аргенціны і Галандыі.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by



Выканаўцы мастацкіх афарміцельскіх работ Артур МІХАЛЁНАК і Сяргей ШАБАЕЎ рыхтуюць фрагменты дэкаратыўнага пано па матывах беларускага арнаменту.



# КАБ МІНСК СТАЎ ГОРАДАМ-СВЯТАМ

Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з выканаўцай абавязкаў дырэктара сталічнага прадпрыемства «Мінскрэклама», калектыў якога адказвае за мастацкае афармленне сталіцы, Таццянай КАЛІЦІНАЙ.



**— Таццяна Леанідаўна, калі мы сустракаліся два гады таму, у калектыву былі досыць высокія вытворчыя тэмпы ў выкананні як заказаў па афармленні мегаполіса, так і дагаварных падрадаў па вонкавай рэкламе...**

— Тэмпы не толькі захавалі, але і нарасцілі. У першую чаргу работ, якія мы выконваем у адпаведнасці з заказам камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама. Падрадных работ па вонкавай рэкламе — таксама. Задачы, якія ставіліся перад намі на працягу года, выконваліся своечасова.

А год быў напружаным. Спачатку рыхтаваліся да 70-годдзя Перамогі, якое прыйшло ўслед за такой жа слаўнай гадавінай вызвалення. Асабіста я не ведаю ў грамадстве раўнадушных да гэтай падзеі. Я бачыла агульны пазітыўны настрой і на прыкладзе свайго калектыву, які працаваў на сур'ёзным эмацыянальным уздыме. Думаю, гэта адчувалася і па нашай прадукцыі.

Мы разумелі, што ад нас чакаюць атмасферы свята і мы павінны яе стварыць. Павінны адпрацаваць канструкцыі, каб не падвялі. Адпрацаваць афарміцельскія колеры і гэтак далей. Пры фарміраванні эскізных прапаноў творчая група дызайнераў зыходзіла з таго, што планка ўзнята высока.

Сёлета адным з сімвалаў Перамогі ў нашым выкананні стала бутаньерка з яблыневым цветам. Ідэя была не наша, унёс яе ЦК БРСМ, у нас яна атрымала сваё развіццё і ўвасабленне. Гэтая бутаньерка ўсіх радавала спачатку 9 мая, потым 3 ліпеня, бо сам год стаў годам Вялікай Перамогі.

Час быў адказны і з палітычнага пункту гледжання: прайшлі выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адбылася інаўгурацыя. Мы ўдзельнічалі ва ўсіх гэтых мерапрыемствах дастаткова актыўна. Уся вонкавая рэклама ляжала на нас: бігборды, плакаты, сцягі, прэс-панэлі, на фоне якіх вяліся інтэрв'ю. Адных толькі стэндаў для агітацыі было больш за 260, шэраг з іх зрабілі кардынальна новымі, і ўсе яны былі ў найбольш ажыўленых месцах. Зноў жа стаяла задача: людзі павінны адчуць, што дзень выбараў кіраўніка дзяржавы — гэта агульнанацыянальнае свята.

З нашым непасрэдным удзелам мінчане святкавалі Дзень горада. З графікай да Дня горада і з колерамі свята мы не памыліліся. Горад сустрэў свой 948 дзень нараджэння ў вясёлай, святочнай гаме.

Шмат было мерапрыемстваў, прысвечаных Году моладзі, што мы таксама павінны былі ўлічваць пры іх афармленні. А на кінафестывалі «Лістапад» кардынальна па-новаму выкарысталі канструкцыі ў эпіцэнтры падзеі — у раёне кінатэатра «Масква», ды і сам горад афармілі дастаткова цікава, з творчай задумкай.

Неабходна адзначыць, што наша прадпрыемства афармляе горад і шляхі следавання міжнародных дэлегацый, якія наведваюць краіну з афіцыйнымі і рабочымі візітамі. Існуе фармат сустрэчы кіраўнікоў замежных дзяржаў, згодна з якім аэрапорт, дарога ў Мінск, цэнтральныя праспекты афармляюцца сцягамі расквечвання, прывітальнымі плакатамі, сучаснымі плакатніцамі. Нашы нацыянальныя сцягі чаргуюцца з нацыянальнымі сцягамі краіны госця.

Хацелася б думаць, што такія мерапрыемствы ў нас атрымліваюцца. Хаця б таму, што водгукі заўсёды станоўчыя. А горад прыгожы, чысты, і гэта з'яўляецца цудоўным фонам для любога свята ці падзеі. Дзякуючы сваёй архітэктуры Мінск ніколі не быў пахмурным, насупленым, змрочным, і дастаткова нават некалькіх яркіх штрыхоў, каб ён заззяў, заіскрыўся, стаў горадам-святам.

**— Такім чынам, вы — калектыў, які адказвае за святы. Пагаворым пра зусім блізкі Новы год.**

— Наш навагодні падарунак мінчанам — абноўленая галоўная ёлка краіны вышынёй больш за 30 метраў на плошчы каля Палаца Рэспублікі. Мы яе мадэрнізавалі, зараз яна не мае традыцыйнай формы конуса, апранулі ў лапкі, і ў выніку яна больш падобная да натуральнай, да сапраўднай лясной прыгажуні. Канструкцыя цяжкая, яе вага павялічылася на 4 тоны, дыяметр тросаў павялічыўся ў паўтара разы. Галоўная ёлка ўпрыгожана, і можна лічыць, што свята пачалося. Акрамя таго, 19 ёлак устанаўліваем па горадзе, у тым ліку каля гарадской ратушы і Мінгарвыканкама.

Прыбралі да навагодняга свята будынак чыгуначнага вакзала і Камароўскі рынак: усім падабаецца, але не ўсе ведаюць, чыя гэта работа. Што будзе новае — гэта 3D-інсталяцыя ў Верхнім горадзе, у раёне ратушы.

Вось-вось мінчане зноў убачаць вялікае святочнае пано на педагагічным універсітэце. Яно ўнікальнае і складаецца амаль з 9 тысяч сцяжкоў. Мантажнікі выкладваюць іх згодна з нумерацыяй, каб атрымалася агульная прыгожая карціна — своеасаблівы навагодні габелен.

Сёлета ў Санкт-Пецярбургу прайшоў форум рэкламшчыкаў. Калег зацікавіў і быў дастаткова высока ацэнены наш вопыт па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе і наш расказ пра вось гэтае пано. Зараз раздаюцца тэлефонныя званкі ад калег, якія таксама хочуць мець такое ж у сябе.

**— Вы вырашаеце двухадзіную задачу — афармленне горада і вонкавая рэклама. Што ў прыярытэце?**

— Складанасць у тым, што пастаянна ставяцца сур'ёзныя задачы па афарміцельскіх работах і яны ў безумоўным прыярытэце. Тут існуе свая вытворчасць, і свая вытворчасць ёсць у нашай рэкламнай службы. У стварэнні рэкламы таксама задзейнічаны дызайнеры, участак друкаванай прадукцыі і ўчастак па мантажу рэкламы. Гэтая сфера дзейнасці дапамагае нам развівацца і падтрымліваць на належным узроўні свой сацыяльны пакет.

**— Важна, што дзякуючы высокапрафесійнай рабоце калектыву рэклама ў Мінску ўспрымаецца як паўнавартасны элемент афармлення...**

— Год для рэкламы таксама быў не простым, рэкламны рынак «прасеў». Тым не менш мы задачу выконваем. У многім дзякуючы падтрымцы Мінгарвыканкама. З яго боку існуе дастатковая ўвага да нашага калектыву, разуменне яго патрэб, у тым ліку далейшага развіцця. У нас для яго перашкод няма. Калі, напрыклад, уносім абгрунтаваную прапанову павялічыць колькасць рэкламных носьбітаў, то горад заўсёды ідзе насустрач. Калі ёсць разумная ідэя, яна заўсёды знаходзіць станоўчы водгук у кіраўніцтва горада. А мы ў сваю чаргу імкнёмся выконваць задачы, што ставяцца перад калектывам, аператыўна і якасна.

Пры гэтым працуем рэнтабельна, па прынцыпе «пад ключ», маем прыбытак. Развіваемся ў асноўным за кошт таго, што зарабілі самі, грошай на мадэрнізацыю не просім.

А наконт рэкламы як элемента афармлення скажу так. Пры яе выкананні імкнёмся захоўваць пачуццё меры, бо ў сталіцы склалася пэўнае асяроддзе пражывання і ўрывацца ў яго не варта, каб нікога не раздражняць. Зыходзім з простага правіла: рэклама павінна дапамагаць, а не перашкаджаць жыць. Тады яе будзе роўна столькі, колькі патрабуецца. Прывяду просты прыклад з практыкі. За намі замацавана траса М2, якая вядзе да Нацыянальнага аэрапорта. Едзем па ёй і глядзім вачыма госця сталіцы — дзелавога чалавека ці нават простага турыста. А яму ў незнаёмым горадзе важна, каб на шчытавых рэкламных канструкцыях была размешчана рэклама камфартабельнага гатэля, надзейнага банка ці каб яму парэкамендавалі зручнага сеткавага аператара. Каб прысутнічала рэклама аб'екта аховы здароўя, куды можна звярнуцца ў выпадку неабходнасці, ці страхавой кампаніі. Яму важна пазнаёміцца з лепшымі нашымі вытворцамі, і на яго шляху ёсць адпаведная інфармацыя. Такім чынам паступова ўводзім госця ў рытмы жыцця сваёй краіны. Знаёмім яго з неабходнымі яму паслугамі ці карыснымі адрасамі, цікавымі нават з пункту гледжання баўлення часу, краязнаўства. Значыць, прысутнічае рэклама знакавых турыстычных аб'ектаў, такіх як Мірскі замак ці палац у Нясвіжы.



Дызайнер Святлана ПАСНЕНКОВА дапамагала ўпрыгожваць галоўную навагоднюю ёлку сталіцы.



Супрацоўнікі аддзела афармлення рэкламы Іна КАСЬЯНАВА і Юлія ХАМАЗЮК былі ў ліку тых, хто займаўся вырабам модуляў велізарнага пано, складзенага амаль з дзевяці тысяч рознакаляровых сцяжкоў.

**— Пры вырашэнні сваіх задач у якой ступені вы ўлічваеце архітэктурны стыль горада?**

— Нашы канкрэтныя прапановы па афармленні праходзяць экспертызу заказчыка, камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама. Калі архітэктар будзе супраць, мы дазволу не атрымаем. Усе альбомы, якія робім, узгадняем з камітэтам. Пакуль момантаў узаемнага неразумення не было.

**— У кожнага горада свой твар. У курортнага цэнтра ён адзін, у буйнога прамысловага мегаполіса — іншы. Як вы лічыце, ці рэальна зрабіць беларускую сталіцу «горадам з чалавечым тварам»? Першыя крокі — відавочныя. Вісяць рэкламныя канструкцыі з партрэтамі знакамітых спартсменаў, і яны цудоўна «глядзяцца».**

— У верасні стартаваў праект «Я Мінск». Па ініцыятыве галоўнага ўпраўлення ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама пачала дзейнічаць новая камунікацыйная пляцоўка, якая пазнаёміць мінчан і гасцей сталіцы са сціплымі працаўнікамі, што сумленна выконваюць сваю работу і з'яўляюцца паўнапраўнымі гаспадарамі горада. Ужо прадстаўлены прыгожы партрэт-плакат Жанны Зубковай з подпісам «Гэта я адкрываю метро ў 5.30 раніцы», які знаходзіцца каля станцый метро «Партызанская» і «Пятроўшчына». На праспекце Незалежнасці і на вуліцы Янкі Купалы — партрэт-плакат скульптара Сяргея Бандарэнкі з подпісам: «Гэта я аўтар скульптур каля цырка». Знойдуць свае месцы білборды з выявамі юнармейца Сашы Выхоты, яна стаіць на варце каля Вечнага агню; стваральніка маладзёжнага цэнтра вулічнай культуры і спорта «ПРОКАЧ» Аляксандра Войнава; дыктара Аляксандра Крапіневіча, гэта ён аб'яўляе прыпынкі ў грамадскім транспарце. Праект, у якім мы таксама ўдзельнічаем, будзе развівацца.

А яшчэ вядзецца фотаздымка персаналій праекта «Мінчанін года». Ёсць і прыгожыя партрэты тых, хто прызнаны «Майстрам года».

**— Як выконваецца план рэканструкцыі і тэхнічнага пераўзбраення, Таццяна Леанідаўна?**

— За апошні час мы абсталявалі ўчастак аператыўнай паліграфіі. Тут на ўзбраенні шырокафарматны прынтар, які друкуе ЭКА-сальвентным чарнілам, інтэр'ернай якасці. У наяўнасці лазернае шматфункцыянальнае прыстасаванне — па сутнасці каляровы лазерны прынтар. І ёсць абсталяванне для паслядрукарскай апрацоўкі — прафесійны рулонны ламінатар, аўтаматычная фальцавальная машына высокай прадукцыйнасці. Вялікі ламінатар для шырокафарматнай машыны, перфабіндары і іншае абсталяванне.

**— Вы адказваеце за ўсе рэкламныя палі ў горадзе з пункту гледжання тэхнічнага інспектавання. У тым ліку на МКАД.**

— Тэхнічны стан носьбітаў рэкламы ў горадзе ўвогуле здавальняючы, і гэта пры тым, што толькі асноўных апаратаў больш за 40. Агульную мову мы знайшлі. Але складана з іншымі: апошнім часам узрасла колькасць незаконна размешчанай рэкламы, напрыклад на асфальце. Ды і розных шыльдаў, указальнікаў, пілонаў, светлавых канструкцый на фасадах будынкаў, не аформленых ва ўстаноўленым парадку. Нашы кантралёры іх выяўляюць, выносім свае папярэджанні, а калі не дапамагае, то перадаём «кліента» ўпраўленню гандлю і паслуг Мінгарвыканкама, і парушальнік атрымлівае прадпісанне. З'ява набывае характар устойлівай праблемы, штодзённа накіроўваем ад пяцідзесяці да ста (!) пісем у арганізацыі з патрабаваннем узаконіць сваю рэкламу, станоўча рэагуе толькі палова.

**— У калектыве 227 чалавек. На каго часцей абапіраецца кіраўнік?**

— На прадпрыемстве працуюць унікальныя людзі. І важна, што кожны чалавек — на сваім месцы. Абапіраемся ў першую чаргу на ветэранаў працы. Гэта надзвычай надзейныя людзі: Галіна Пятроўна Таратута, Васіль Сяргеевіч Кузняцоў, Анатоль Ігнацьевіч Палячок, Ала Альбертаўна Палякова, Пётр Мікалаевіч Пракапенка, Іван Іванавіч Вайцекян, Галіна Мар'янаўна Камарова, Валянцін Яўгенавіч Лазавік, Мікалай Іванавіч Мітраховіч, Ігар Іванавіч Бражнік, Генадзь Ягоравіч Раеў, Ганна Іванаўна Скрабатун.

Надзейнай апорай становяцца і маладыя. Тая моладзь, што прыйшла да нас і затрымалася, — прафесійна цудоўна падкаваныя, па-добраму яршыстыя, надзвычай сучасныя, мабільныя маладыя людзі з багажом ведаў і жаданнем прымяніць іх на практыцы. Яны цябе чуюць і разумеюць. Існуе карпаратыўны дух, які дапамагае працаваць.

Кожны раз з разуменнем ставімся, калі прыходзіць сын ці дачка работніка і просіць прыняць у штат. Кажучы фігуральна, «па-за штатам» яны «працуюць» у нас даўно, гэта значыць, дастаткова ведаюць са слоў бацькоў пра працу, жывуць нашымі клопатамі, жадаюць нам поспеху. І мы лічым, што дынастыі цэментуюць калектыў.

У заключэнне неабходна адзначыць, што паспяховай рабоце прадпрыемства спрыяе і актыўная дзейнасць пярвічных арганізацый грамадскіх аб'яднанняў «Белая Русь» і БРСМ.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 100302749



— Такога Дзеда Мароза не пашкодзяць ніякія дажджы са снегам! — запэўніла начальнік участка друкаванай прадукцыі Кацярына КОЖУХ, паказваючы пано на паліэстэравай тканіне, выкананае алейным чарнілам.

## У пошуках рукатворнай прыгажосці

**Расказвае начальнік аддзела дызайну Сяргей ГЛУХАЎ:**

— За апошнія чатыры гады «Мінскрэклама» атрымала сур'ёзнае развіццё. Усё часцей нам даяраюць прадстаўнічыя заказы, заказы да народных свят і палітычных мерапрыемстваў, а таксама спецзаказы, інавацыйныя праектныя рашэнні. Успомнім стэнд Мінгарвыканкама на міжнароднай спецыялізаванай выставе ЦІБА. Гэта самая інтэлектуальная выстава ў Беларусі, у якой удзельнічаюць найбуйнейшыя прадпрыемствы інавацыйнага профілю. І стэнд горада павінен быць візітоўкай гарадскіх улад. Запраектавалі яго так, што ён трэці год з'яўляецца эталонам навізны. А летась стыль, у якім ён выкананы, паўтарылі для больш шырокай аўдыторыі, на свяце горада — у раёнах Мінска. Атрымалася незвычайна і цікава.

Можна ўспомніць таксама перамогу на конкурсах з удзелам шматлікіх інстытутаў і дызайнерскіх цэнтраў на найлепшую канцэпцыю сацыяльных плакатаў «Тое, што нас аб'ядноўвае». Можна назваць удалыя афарміцельскія элементы для міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Іаханэса Рау і новага аўтасалона АУДЗІ, а таксама сумесны ўдзел з прэзідэнцкім спартыўным клубам у акцыі «Пасябруй са спортам», у выніку якой мы выпусцілі 60 плакатаў плошчай 18 квадратных метраў з партрэтамі дзяцей-пераможцаў і маленькія мастакі атрымалі грамадскае прызнанне.

Мы павінны штогод абнаўляць твар сталіцы. Гэта наша стратэгія. Дызайнеры пастаянна фантаніруюць новымі ідэямі. Збіраемся ў хуткім часе ўнесці кардынальную навізну — ужо ў 2016 годзе масава прымяніць штучныя поўнамаштабныя кветкі з шаўковай тканіны, нацягнутай на каркас. А ў перспектыве чакае пераход да поўнамаштабнай ручной творчасці. Напрыклад, графіці. А таксама напольны ручны аўтарскі 3D-малюнак. Гэта тое, за чым будучыня.

Плануем развіваць у сябе пнеўматыку — выкарыстанне надзіманых фігур і структур.

Вядома, мы адказваем за афармленне ўсяго горада. Але вялікая ўвага — і пляцоўкам, любімым мінчанамі, — Кастрычніцкай плошчы і плошчы Незалежнасці, пляцоўцы каля Палаца спорту, плошчы Дзяржаўнага сцяга, пляцоўцы каля новага будынка музея Вялікай Айчыннай вайны...

Тры гады таму пры падрыхтоўцы да чарговага Дня горада арганізатары свята вырашылі правесці святы па раёнах і мы прапанавалі афармленне раённых пляцовак, на якіх усё гэта будзе адбывацца. Загадзя аформілі дзевяць. Са сцэнамі, яркімі сцягамі і плакатамі, з ратацыяй іншых формаў. Гэта было так нечакана, стала такім феерверкам, падзеяй само па сабе, бо людзі ўбачылі, што ўлада паклапацілася пра іх. І гэта стала добрай традыцыяй.

ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ МИНСКРЕКЛАМА

НАРУЖНАЯ РЕКЛАМА «ПОД КЛЮЧ»

Производство наружной рекламы:
- дизайн
- широкоформатная печать ( HP Scitex 850LX) 3,2 м.
- изготовление вывесок, объёмных букв, световых коробов
- металлоконструкции
- оперативная полиграфия
-аренда автотранспорта

Размещение наружной рекламы:
- биллборды, путепроводы, рекламные ограждения в Минске
- рекламные растяжки
- биллборды на МКАДе
- биллборды по трассе М2 (Минск - Национальный аэропорт «Минск»)

Оформление территорий и масштабных городских мероприятий:
- пилонами, плакатницами, флаговыми конструкциями
- ограждение строительных площадок
- аренда крытого сценического комплекса
- украшение новогодних ёлок.

Паспортизация наружной рекламы по принципу «Одно окно»

www.minsk-reklama.by
приемная: 8 (017) 290-55-06

Краіна здароўя
Выпуск № 22 (352)



■ Сезон праступ

# ЗАБАЛЕЛА ВУШКА

Большасць вострых рэспіраторных вірусных інфекцый у дзяцей хутка праходзіць дзякуючы абарончай функцыі арганізма, правільнаму догляду і адэкватнаму лячэнню.

**Аднак у некаторых выпадках бываюць ускладненні. Атыт адносіцца да найбольш распаўсюджаных ускладненняў вірусных рэспіраторных інфекцый у дзяцей. Гэтаму спрыяюць асаблівасці анатамічнай пабудовы: у малых дзяцей кароткая, шырокая і больш гарызантальная слыхавая труба, якая злучае поласць насаглоткі і сярэдняе вуха, а значыць, інфекцыя можа лёгка пранікаць з насаглоткі.**



## Што можа выклікаць?

Інфекцыйныя хваробы (адзёр, краснуха), частыя адрыжкі (рэшткі ежы могуць трапляць у сярэдняе вуха праз слыхавую трубу і выклікаць запаленне), запаленне адэноідаў.

У малых дзяцей атыт пачынаецца раптоўна, з'яўляецца рэзкі боль у вуху. Старэйшыя дзеці могуць скардзіцца на зніжэнне слыху. Можа падняцца тэмпература да 40 градусаў. У немаўлят атыт можна западозрыць па крыку, плачы, капрызнасці, парушэнні сну, адмове ад грудзей, перакатванні галавой па падушцы, моцным крыку і плачы пры націсканні на вуха. Выдзяленні з яго (могуць быць з прымесямі крыві) сведчаць аб разрыве барабаннай перапонкі.

— Калі гэта не лячыць, можа пагоршыцца вастрыня слыху, а таму пры першых прыкметах захворвання неабходна паказаць дзіця ўрачу, не трэба захапляцца самалячэннем, — адзначае **ўрач-отарыналарынголаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Ірына КОРЗУН.** — Атыт звычайна лечаць антыбіётыкамі цягам 7-10 дзён. Паказана агульная і мясцовая супрацьзапаленчая тэрапія, адпаведны догляд вонкавага слыхавога прахода, аднаўленне праходнасці еўстахіевай трубы, нармальнага ціску ў барабаннай поласці. Бывае, што патрабуецца і пракол барабаннай перапонкі.

## Дапамагаем дома

Выкарыстанне сасудазвужальных кропель у нос аднаўляе і праходнасць слыхавой трубы, нармалізуе ціск у барабаннай поласці.

✓ Закапайце дзіцяці ў нос сасудазвужальныя кроплі (аддайце перавагу тым, якімі ўжо карысталіся).

✓ Пры павышанай тэмпературы, моцным болі дайце гарачкапаніжальны сродак (у неабходнай дазіроўцы). Прэпараты парацэтамолу і ібупрафену даюць добры эфект.

✓ Забяспечце мясцовую цеплыню. Дастаткова надзець шапачку ці хустку, якая прыкрые вуха. Нельга без прызначэння ўрача класці гарачы кампрэс і грэлку. Пры гнойных выдзяленнях, павышанай тэмпературы прымяняць любыя цеплавыя працэдуры нельга!

✓ Выдаляйце выдзяленні ватнай палачкай, змочанай у 3-працэнтным растворы перакісу вадароду.

## Прадухіляем

Нос, насаглотку і глотку трэба лячыць, прычым своечасова. Асабліва гэта адносіцца да адэноідаў. Калі дзіця цяжка дыхае носам, спіць з адкрытым ротам, храпе, трэба паказацца отарыналарынголагу. Калі ўрач настойвае на выдаленні адэноідаў, абдумайце і пагаджайцеся на гэту працэдуру.

Лячыце своечасова і ўсе іншыя вірусныя і бактэрыяльныя захворванні. Для немаўлят найлепшай прафілактыкай атыту з'яўляецца грудное кармленне.

Ніколі не прымушайце дзіця дзьмуць у нос з намаганнем. Слізь пры гэтым можа трапіць у еўстахіевую трубу, што непасрэдна спрыяе развіццю атыту. Наогул, праходнасць гэтай трубы звычайна парушаецца ў выніку пападання густой слізі. Яна павінна заставацца вадкай пры рэспіраторных інфекцыях. Для гэтага як мага больш паіце дзіця, а таксама падтрымлівайце ў памяшканні тэмпературу, не вышэйшую за +21 градус, і вільготнасць на ўзроўні 60 працэнтаў.

Выкарыстоўвайце гарачкапаніжальныя сродкі пры павышэнні тэмпературы звыш 38,5 градуса — ліхаманка павялічвае страту вадкасці і спрыяе перасыханню слізістых абалонак ■

■ Асцярожна!

# ХАДОЙ ПІНГВІНА

## ПРАДУХІЛІЦЬ ЗІМОВУЮ ТРАЎМУ НЯПРОСТА, АЛЕ БУДЗЕМ СПРАБАВАЦЬ



**Можа быць, гэтая зіма і будзе даволі цёплай, але паслізнуцца можна і на мокрым снезе, і на апалым лісці ў дождж. Так што зімовыя траўмы ніхто не адмяняў. Пакуль у спецыялізаваных аддзяленнях зацішша, але спецыялісты гатовы прыняць наплыў пацярпелых. Шкада, што патэнцыяльныя хворыя, хоць і пазіраюць на каляндар (там жа дакладна напісана: зіма прыйшла!), але ніяк не навучацца своечасова рыхтавацца да спецыфічнага сезона. Ці машыну, ці сябе, а нярэдка і ўсё разам, забываюцца «пераабуць». Вось і першая наша вялікая памылка. Праўда, не адзіная.**

Як адзначае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра траўматалогіі і артапедыі Леанід ЛОМАЦЬ**, траўмы складаюць 12 працэнтаў ад агульнай колькасці захворванняў. А ў структуры смяротнасці доля знешніх прычын (траўмаў у тым ліку) складае 8 працэнтаў. Гэта чацвёртае месца пасля сардэчна-сасудзістай, анкалагічнай паталогіі і так званых смерцяў ад старасці (ёсць і такі дыягназ — выстаўляецца толькі па дасягненні 80-гадовага ўзросту). Доўгія гады, праўда, размова ішла пра 10 працэнтаў, а зніжэнне нават на два працэнты — гэта тысячы выпадкаў.

Калі ў 2010 годзе ад знешніх прычын загінулі 14 281 чалавек, то летась — 9 684. На думку Леаніда Мікалаевіча, зніжэнне істотнае. Адкуль жа яно ўзялося? Можна меркаваць, што спрацавала наша свядомасць, абуджэнню якой паспрыялі, галоўным чынам, два моманты: нягледзячы на бясплатную медыцыну, хварэць і лячыцца ўсё ж такі становіцца дорага, а па-другое, дорага яшчэ і плаціць штрафы за парушэнне тых жа правілаў дарожна-транспартнага руху, дзе ў сур'ёзных выпадках без траўмаў не абысціся.

### Запомніце і рабіце

**1.** Не выпускайце з-пад увагі дзяцей, якія за зімовымі гульнямі і забавамі забываюцца на асцярожнасць і абачлівасць. Нават звычайнае катанне на каньках можа скончыцца сур'ёзнай траўмай. І не толькі ў выніку ўласнага падзення, але, што значна горш, калі цябе збівае з ног той, хто страціў раўнавагу.

**2.** Не бяжыце за транспартам. Нават калі спазняецеся. З траўмай вы не толькі спозніцеся, але і наогул будзеце па-за работай доўгі час.

**3.** Будзьце ўважлівымі там, дзе бачыце слізкую плітку, а таксама на любых прыступках.

**4.** Хадзіце ў галалёд «паходкай пінгвіна» — павольна, не моцна адрываючы ногі ад зямлі.

### Калі звяртацца да ўрача?

Адкрыты перелом прапусціць цяжка. А вось ва ўсіх іншых выпадках звяртайце ўвагу на боль падчас руху, прыпуханне, пасіненне (пры пашкоджанні сасудаў будзе кровазліццё). Нават калі вам здаецца, што «нічога страшнага», пакажыцеся траўматолагу. Застарэлая траўма — а гэта нават некалькі дзён без лячэння — можа так абмежаваць рух у суставе, што наступнае лячэнне будзе і пакутлівым, і вельмі працяглым, а вынік негарантаваным.

Важна, вядома, каб супастаўленне касцей пры пераломе было ідэальным, каб рух у суставе не абмежаваўся. Не так даўно беларус атрымаў у Еўропе падчас катання на лыжах траўму косці. Страхоўка ў небаракі была добрая, але першую дапамогу яму аказалі не на найлепшым узроўні. Ужо на радзіме ўрачы выявілі, што зрастанне адбылося няправільна, рука амаль не рухалася... Тутэйшыя ўрачы прапанавалі ламаць і складаць наноў.

**Што мець на ўвазе пад траўмай? Ударанае месца (пашкоджанне мяккіх тканак), расцяжэнне звязак (можа спатрэбіцца накладванне павязкі), вывіх (лепей не самому ўпраўляць, а паказаць спецыялісту), пералом/вывіх, пераломы адкрытыя і закрытыя.**

Сучасная медыцына здольна ўжо на многае. Узяць хоць бы траўмы ў сталых людзей, калі косці становяцца нетрывалымі і пераломы здараюцца нават пры падзенні з ложка. Раней з пераломам шыйкі бядра хворы ў хуткім часе гінуў, паколькі развіваліся такія цяжкія ўскладненні, як пнеўманія і інш. Сёння ж адразу разглядаецца пытанне замены сустава, пасля чаго чалавек здольны да самаабслугоўвання, што, безумоўна, не проста выратоўвае жыццё, але і спрыяе захаванню яго якасці. Разам з тым, як бы ні развівалася медыцына, сама па сабе яна не здольна прадухіліць усе траўмы на свеце. Хоць імкнуцца да зніжэння самых цяжкіх выпадкаў усё ж такі варта. Што і рэкамендуе Сусветная арганізацыя аховы здароўя.

У першую чаргу, гэта ўвядзенне больш жорсткіх мер у заканадаўства па зніжэнні дарожна-транспартных здарэнняў. Вось узаконілі дзіцячыя аўтамабільныя крэслы — і адразу ёсць эфект. Два сёлетнія прыклады з жыцця. Дзіця ў аўтамабілі хоць і сядзела ў дзіцячым крэсле, але не было прышпіленым. На вялікай хуткасці машына перавярнулася, вадзіцель застаўся жывым, дзіця загінула. У другім выпадку жанчына-вадзіцель прышпіліла і сябе, і траіх дзяцей. Калі яна заснула за рулём, машына перавярнулася, але ніхто з пасажыраў не атрымаў цяжкай траўмы.

Калі працягваць аўтамабільную тэму, то вялікая група траўмаваных прыпадае і на катэгорыю пешаходаў, веласіпедыстаў ды матацыклістаў, сярод якіх здараецца найбольшая колькасць смяротных выпадкаў. Дарэчы, пра веласіпеды. Цяпер усталявалася такое надвор'е, што дагэтуль некаторыя аматары перасоўваюцца на двух колах. Але гэта не абачліва. Ёсць, праўда, еўрапейскія краіны, кшталту Даніі, дзе такім відам транспарту карыстаецца ледзь ці не кожны датчанін і амаль круглы год. Але ў Капенгагене крыху іначай з умовамі надвор'я — гэта раз. Там стварылася своеасаблівая культура веласіпедыстаў — гэта два. Для іх звыклая справа — дабірацца з прыгарада ў Капенгаген на электрычцы разам з двухколавым сябрам, на які перасаджвацца па прыбыцці. Нам жа трэба неяк улічваць свае асаблівасці ■

### Навука падаць

Што галоўнае перад выхадам на вуліцу? Правільна апрануцца. Адзенне павінна быць свабодным, каб не перашкаджала нашым рухам, абутак жа — на няслізкай падэшве і нізкім абцасе.

Што галоўнае пры падзенні? Паспець згрупавацца. Трэба ўхітрыцца ўпасці не з вышыні ўсяго росту, а быць як мага ніжэй, а значыць, неабходна крыху прысесці.

### Майце на ўвазе...

...што падзенне на спіну пагражае пераломам копчыка (даволі складана лечыцца, нярэдка становіцца хранічнай паталогіяй), пераломам пазваночніка (не ўсе такія траўмы патрабуюць хірургічнага ўмяшання, але ўсё роўна працэс аднаўлення даволі цяжкі).

...што падзенне наперад — гэта магчымыя траўмы кісцяў рук, дзе шмат дробных касцей, ідэальна залячыць якія вельмі няпроста. Не выстаўляйце наперад рукі ў момант падзення.

...што падчас любога падзення можна траўмаваць і галёнкаступнёвы сустаў (яго сёння можна нават пратэзаваць, але ўвогуле лячэнне працяглае і складанае).

...што падзенне на бок пагражае пераломам бядра (звычайна ў пажылых). Тым не менш, менавіта такое падзенне з'яўляецца аптымальным варыянтам.

■ Візіт да стаматолага

# ЧЫСЦІМ УЛЬТРАГУКАМ

## Рэгулярны прафесійны догляд зубоў становіцца ўсё больш запатрабаваным



**Для спецыялістаў не навіна, што ідэальна ачысціць зубы ад налёту не атрымліваецца, нягледзячы на вялікую колькасць сродкаў для гігіены ротавай поласці. Каля 40 працэнтаў рэшткаў ежы і налёту застаюцца ў міжзубных прамежках і ля самай дзясны. З цягам часу яны ператвараюцца ў зубны камень, правакуюць развіццё карыесу, запаленне дзяснаў.**

Па статыстыцы, абсалютная большасць дарослых людзей маюць зубныя адкладанні.

«Яшчэ нядаўна для догляду ротавай поласці выкарыстоўвалі механічныя інструменты, а сёння шырока выкарыстоўваюцца апаратныя спосабы гігіенічнай чысткі зубоў, — расказвае **ўрач стаматолаг-тэрапеўт 9-й стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Маргарыта МАКОЎСКАЯ.** — Увесь комплекс прафесійнага догляду зубоў складаецца з некалькіх этапаў. Спачатку стаматолаг павінен уважліва агледзець і ацаніць стан усёй ротавай поласці: язык, дзясны, зубы. Далей вызначаецца колькасць зубнога налёту і каменя (калі патрабуецца, то і з афарбоўкай), ступень пашкоджання калязубных тканак. Стаматолаг прапануе найбольш аптымальны метад прафесійнага догляду за ротавай поласцю і адпаведнае абязбольванне пры павышанай адчувальнасці зубоў».

**Зняцце зубных адкладанняў ультрагукам абсалютна не балючае і бяспечнае. Прымяняецца такая методыка, калі зубныя камяні і налёт размешчаны не толькі на зубах, але і праніклі ў парадантальныя кішэні.**

Для правядзення працэдуры выкарыстоўваюць **ультрагукавы скейлер** з комплексам насадак рознай формы. Ён уздзейнічае на адкладанні мікравібрацыямі. Эфект ахалоджвання стварае вадзяны напор, які зніжае непрыемныя адчуванні і дапамагае выдаліць зубны камень. Даказана, што менавіта ўльтрагук дазваляе разбурыць мікробную плёнку на зубах на досыць працяглы час.

**Для зняцця мяккага зубнога налёту, невялікіх адкладанняў каменя, асвятлення зубоў выкарыстоўваецца air flow.** У гэтым выпадку пад высокім ціскам праз спецыяльны наканечнік на паверхню зуба падаецца сумесь бікарбанату натрыю (соды), вады і паветра. Пры масіўных адкладаннях гэты метад прымяняецца толькі дадаткова да ўльтрагукавога скейлера.

Пасля выдалення адкладанняў на паверхні зубоў застаюцца мікраскапічныя шурпатасці. Гэтыя няроўнасці могуць справакаваць хуткае ўтварэнне новых камянёў. Паліроўка зубоў з дапамогай спецыяльных паст, шчотак і іншых прылад выдаляе шурпатасці і лёгкі пігментны налёт, робіць паверхню зуба гладкай і бліскучай.

Для прафілактыкі стаматалагічных інфекцый і зніжэння рызыкі ўзнікнення інфекцыйных запаленчых рэакцый ротавая поласць апрацоўваецца антысептыкам, дэзінфекцыйным растворам. Заканчваецца працэдура фтарыраваннем эмалі з дапамогай спецыяльных лакаў, гелю, што знімае павышаную адчувальнасць зубоў і павышае іх устойлівасць да карыесу. Пасля гігіенічных працэдур, у залежнасці ад характару запалення ў дзяснах, стаматолаг падбярэ курс супрацьзапаленчай тэрапіі або спецыяльныя зубныя пасты, дапаможа выбраць зубную шчотку.

Прафесійная гігіена можа выконвацца ад 1 да 4 разоў на год. Колькасць працэдур залежыць ад хуткасці ўтварэння налёту, адхілення ў пабудове зубных радоў, якасці штодзённай гігіены ротавай поласці, наяўнасці артапедычных канструкцый і брэкет-сістэм.

Гігіенічная чыстка рэкамендавана тым, хто плануе комплекснае стаматалагічнае лячэнне і адбельванне зубоў.

Але, нягледзячы на бяспеку сучаснага абсталявання для правядзення прафесійнай гігіены, існуюць і процілпаказанні.Апаратныя метады не прымяняюць у пацыентаў з кардыястымулятарамі, вострымі стаматалагічнымі і рэспіраторнымі інфекцыямі. Непажадана выкарыстоўваць ультрагукавыя скейлеры ў дзяцей да 14 гадоў, цяжарным у першым трыместры. Пры наяўнасці процілпаказанняў гігіенічныя працэдуры праводзяцца з дапамогай ручных інструментаў, спецыяльных паст і шчотачак ■

■ Памятка

# ПРЫМАЕМ ФІЗІЯТЭРАПІЮ

1. Прыходзьце ва ўстаноўленыя дні і гадзіны.

2. Адпачніце перад сеансам 10-15 хвілін.

3. Перад некаторымі працэдурамі неабходна зняць металічныя ўпрыгажэнні, каб пазбегнуць апёкаў.

«Скажыце медсястры аб любым пагаршэнні самаадчування, слабасці, павышанай тэмпературы, — кажа **загадчык фізіятэрапеўтычнага аддзялення 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі Таццяна КУДЗЕРСКАЯ.** — Адключыце мабільны тэлефон дзеля сваёй жа бяспекі. Падчас лячэння неабходна пазбягаць фізічнага і разумовага перанапружання, дастаткова адпачывайце, своечасова харчуйцеся, трымайце цела ў чысціні. Уважліва слухайце ўсе рэкамендацыі медсястры і строга выконвайце іх падчас і пасля працэдуры».

• Не рухайцеся, не дакранайцеся да апаратаў, батарэй ацяпляльнай сістэмы, водаправодных труб, не выключайце апарат і не знімайце электроды самастойна.

• Сядзіце або ляжыце спакойна, не размаўляйце і не чытайце. Не спіце, калі толькі гэта не электрасонтэрапія.

• Паведамляйце медсястры аб дрэнным самаадчуванні, болі, непрыемных адчуваннях падчас працэдуры.

• Падчас святлолячэння нельга самастойна змяняць становішча цела і адлегласць да лямпы.

• Інгаляцыі прымаюцца не раней як праз 1,5 гадзіны пасля прыёму ежы або фізічнага напружання. Пасля інгаляцыі цягам гадзіны нельга размаўляць, есці.

• Калі прызначана некалькі працэдур, то інгаляцыі праводзяць пасля электра- і святлотэрапіі.

• Пры з'яўленні пасля працэруры на месцах уздзеяння непрыемных адчуванняў або высыпак абавязкова трэба сказаць пра гэта медсястры на чарговым сеансе.

• Пасля працэдур пазбягайце пераахаладжвання, асабліва ў сыры і халодны час года. Не выходзьце адразу на вуліцу, адпачніце ў холе 20-30 хвілін ■

**У новым, 2016-м, годзе**
**ў «КРАІНЕ ЗДАРОЎЯ»**
**вы знойдзеце**

кампетэнтныя парады
спецыялістаў
на самыя розныя тэмы:
*— як умацаваць сэрца і сасуды;*
*— што з'есці, каб не патаўсцець;*
*— як супрацьстаяць анкалогіі і жыць з ёй;*
*— што рабіць, каб выцягнуць сябе з залежнасці;*
*— як захаваць псіхічную раўнавагу*
і многае-многае іншае.

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ!**
**ЧЫТАЙЦЕ І НЕ ХВАРЭЙЦЕ!**



■ Прыкметы ўзросту

# Гэты бязлітасны Альцгеймер...

## Калі ў блізкага выявілі дэменцыю



**Паводле адной з гіпотэз, паміж хваробай Альцгеймера і эвалюцыяй мозга ёсць прамая сувязь. Маўляў, сотні тысяч гадоў таму падчас натуральнага адбору ў некаторых генах замацаваліся змяненні, адказныя за развіццё мозга. У прыватнасці, павялічылася колькасць сувязяў паміж нейронамі, і мы сталі разумнейшымі. Аднак тыя ж гены аказаліся вінаватымі і ў развіцці хваробы Альцгеймера.**

Ад гэтага захворвання пакутуе толькі чалавек. Некаторыя кітайскія вучоныя мяркуюць, што ўзнікае яно тады, калі пастарэлы мозг перастае спраўляцца з высокім узроўнем абмену рэчываў, неабходным для функцыянавання высокаразвітога чалавечага інтэлекту. Хвароба Альцгеймера — гэта нейрадэгенератыўнае захворванне, якое з'яўляецца прычынай 50-75 працэнтаў выпадкаў старэчага зніжэння інтэлекту. Пачынаецца яно паступова, але няўхільна прагрэсуе. Асноўны сімптом — страта кароткачасовай памяці і аслабленне функцыі мыслення. На позніх стадыях мозг пашкоджаны настолькі моцна, што хворы становіцца практычна бездапаможным. Эфектыўнага лячэння пакуль не вынайдзена.

Кіраўнік Інстытута неўралагічных даследаванняў у ЗША Эдвард Тобінік сцвярджае, што стан многіх пацыентаў паляпшаецца дзякуючы супрацьзапаленчаму прэпарату этанерсэпт, які прымяняецца звычайна пры лячэнні рэўматоіднага артрыту (у Беларусі ён не зарэгістраваны). Пасля ўвядзення гэтага прэпарату групе хворых у іх адзначалася «абуджэнне» разумовых здольнасцей і памяці. Праўда, праз некалькі дзён патрабавалася новая ін'екцыя. Прэпарат не прайшоў клінічных іспытаў, але пакуль гэта адзіны спосаб палепшыць стан хворага, а не проста затармазіць ход хваробы.

## ЯК ЖЫЦЬ ТЫМ, ХТО ПОБАЧ?

Пачуццё страху, віны, адчаю і несправядлівасці — немагчыма адным словам апісаць усё, што перажываюць тыя, чые блізкія дзень за днём страчваюць сябе. Лёгкія парушэнні ўвагі, памяці, маўлення (калі чалавек не можа адразу падабраць патрэбнае слова) ёсць у больш як 80 працэнтаў мужчын і жанчын пасля 60. Гэта абумоўлена натуральнымі ўзроставымі змяненнямі і не перашкаджае чалавеку жыць. Аднак у 25 працэнтаў людзей старэйшага ўзросту гэтыя расстройствы трансфармуюцца ў дэменцыю. Яе цяжкія формы называюць маразмам, зніжэннем інтэлекту.

Не важна, што стала прычынай дэменцыі: незваротныя парушэнні ў рабоце галаўнога мозга (у выніку захворванняў нервовай сістэмы, парушэння кровазвароту ці абмену рэчываў) кардынальна мяняюць жыццё чалавека. Ён перастае разумець і запамінаць новую інфармацыю, лагічна разважаць, не пазнае сваіх дзяцей, а блізкіх сяброў можа лічыць даўно памерлымі сваякамі. Паступова страчваюцца ўсе жыццёвыя навыкі, немагчыма заставацца аднаму, немагчыма радавацца, здзіўляцца, суперажываць. Чалавек страчвае сваю асобу. Іншае жыццё пачынаецца і для таго, хто бярэ на сябе абавязак клапаціцца аб хворым. Дзеля гэтага нярэдка даводзіцца ахвяраваць работай, бачыць, як аддаляюцца муж (жонка), дзеці і нават сябры, якія не вытрымліваюць пастаяннага напружання.

Сярэдняя працягласць жыцця расце, а значыць, расце і колькасць людзей з дэменцыяй — гэта мільёны людзей ва ўсім свеце, а побач з імі — мільёны тых, каму даводзіцца браць удзел у гэтай драме.

«З таго моманту, як чалавеку паставілі дыягназ «дэменцыя», блізкім неабходна пачынаць вучыцца падтрымліваць стасункі з такім чалавекам», — кажа **загадчыца псіхіятрычнага аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Таццяна ГЕМЗА** і дае некалькі карысных парад.

➤ Гаварыце заўсёды павольна і плаўна, не павышайце тон (хворы з дэменцыяй забывае значэнне слоў, але захоўвае здольнасць да эмацыянальнага перажывання, а таму рэагуе на інтанацыю).

➤ Пераканайцеся, што вам удалося прыцягнуць увагу да вашых слоў (пяшчотна дакраніцеся да блізкага, глядзіце яму ў вочы; калі ён сядзіць, прысядзьце таксама, каб апынуцца на адным узроўні).

➤ Ініцыятыва ў размове, вядома, павінна належаць вам (па меры развіцця захворвання чалавеку ўсё складаней становіцца пачынаць размову самастойна).

➤ Фармулюйце пытанне так, каб на яго можна было адказаць адназначна: «так», «не» або «не ведаю».

➤ Калі вас не зразумелі, паўтарыце фразу некалькі разоў, а пасля сфармулюйце думку іначай.

➤ Мінулае помніцца лепш, чым бягучае (таму з хворым трэба часцей гаварыць пра далёкае мінулае, гэта яго супакойвае).

➤ Калі блізкі чалавек перастаў рэагаваць на вашы фразы, ніколі не гаварыце аб ім у яго прысутнасці ў трэцяй асобе (гэта прыніжае годнасць чалавека) ■

Матэрыялы паласы падрыхтавала
Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

■ З нагоды

# ІМКНЕННЕ ДА ХАРАСТВА

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ НАРОДНЫ АРКЕСТР БЕЛАРУСІ ІМЯ ІОСІФА ЖЫНОВІЧА АДЗНАЧАЕ СВОЙ 85-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ

**З гэтай нагоды карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з галоўным дырыжорам, мастацкім кіраўніком праслаўленага калектыву, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі, народным артыстам рэспублікі М.А. КАЗІНЦОМ.**

***— Міхась Антонавіч, прыміце шчырае віншаванне з юбілеем...***

— Дзякую!

***— ...і нагадайце коратка нашым чытачам гісторыю стварэння аркестра.***

— Калі коратка, то гісторыя яго такая. У 1928 годзе музыка-самавук Дзмітрый Захар арганізаваў ансамбль. Гэта быў напалову аматарскі, напалову прафесійны калектыў. Кіраваў ім Захар, а канцэртмайстрам быў Жыновіч.

У 1930 годзе ансамбль атрымаў статус дзяржаўнага, ад гэтага часу мы і адлічваем сваю гісторыю. Ансамбль іграў простыя беларускія мелодыі. З ім часта выступала папулярная ўжо тады спявачка Ларыса Александроўская. Набіралі вядомасць цымбалісты-віртуозы Аркадзь Астрамецкі і Станіслаў Навіцкі.

У 1937 годзе ансамбль быў пераўтвораны ў Беларускі дзяржаўны аркестр народных інструментаў. На чале калектыву стаў выдатны музыкант свайго часу Канстанцін Семяонаў.

А потым была вайна. Аркестр аднавіў сваю дзейнасць толькі ў 1946 годзе. І кіраўніком яго ўжо стаў Іосіф Жыновіч. Трэба сказаць, што сам аркестр быў створаны па тыпе велікарускіх аркестраў Андрэева, Восіпава. Хаця, зразумела, беларускі калектыў меў сваю адметнасць — цымбалы.

***— А калі вы прыйшлі ў калектыў?***

— Я прыйшоў не адразу. Жыновіч доўга прыглядаўся да мяне. А аднойчы, калі я ўжо заканчваў вучобу ў кансерваторыі, запрасіў мяне да сябе і нечакана прапанаваў правесці двухмесячныя гастролі па Расіі, Украіне і Казахстане. Сам маэстра быў цяжка хворы і прысутнічаў толькі на рэпетыцыях. І выбар быў задаволены, калі гастролі прайшлі паспяхова.

А неўзабаве Іосіфа Іосіфавіча не стала. І ў студзені 1975 года я быў зацверджаны кіраўніком аркестра.

***— Дык атрымліваецца, што сёлета вы адзначалі і свой асабісты юбілей — 40-годдзе кіраўніцтва праслаўленым калектывам.***



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Так, час бяжыць хутка, я і сам не заўважыў, як праміргнулі гэтыя гады.

***— Міхась Антонавіч, а што ўдалося стварыць за гэты час?***

— Я назаву толькі адну лічбу: у рэпертуары нашага аркестра больш за дзве тысячы твораў. Тут і беларуская народная музыка, і творы сучасных кампазітараў, і класічная музыка.

Для нас пісалі кампазітары старэйшага пакалення — Міхалай Чуркін, Анатоль Багатыроў, Яўген Глебаў, Генрых Вагнер, Юрый Семяняка; маладзейшыя — Дзмітрый Смольскі, Кім Цесакоў, Валерый Іваноў, Андрэй Мдзівані... Дарэчы, апошні за свае сімфоніі «Полацкія пісьмёны» і «Памяць зямлі», якія прагучалі ў нашым выкананні, атрымаў Дзяржаўную прэмію рэспублікі. Гэткую ж прэмію атрымаў і Віктар Помазаў. Мы выконвалі яго сюіту «Вясковыя музыкі» і «Батлейку».

***— У аркестры працуе шмат яркіх, таленавітых музыкантаў. Лагічна будзе, калі мы назавём хоць некаторых з іх.***

— Менавіта толькі некаторых, бо ў нас на сённяшні дзень больш за дваццаць лаўрэатаў міжнародных і нацыянальных конкурсаў. Найперш за ўсё гэта кіраўнік малога саставу аркестра і фалькгрупы, можна сказаць, мая правая рука — заслужаны артыст Беларусі Аляксандр Крамко. Такое ж званне маюць канцэртмайстар аркестра Ларыса Рыдлеўская, баяніст Уладзімір Ткач, а таксама Анатоль Курмакін, які зусім нядаўна пайшоў на заслужаны адпачынак. Ну і, вядома ж, не магу не назваць народную артыстку рэспублікі Святлану Лясун, якая спачатку іграла на цымбалах, а апошнім часам — на баяне.

Сёння — магу сказаць гэта з гонарам — у нас адзін з самых моцных саставаў за ўвесь час маёй працы ў аркестры.

***— І апошняе пытанне. Як вы адзначаеце юбілей аркестра?***

— Традыцыйна — вялікім святочным канцэртам. Гэта выбранае з найлепшых твораў, якія былі створаны нашым аркестрам за апошнія пяць гадоў.

У першым аддзяленні прагучаць папулярныя інструментальныя і вакальныя нумары ў выкананні салістаў аркестра Марыны Васілеўскай, Ігара Задарожнага, Андрэя Коласава, Анастасіі Рачыцкай.

Другое аддзяленне складуць урыўкі з паэмы-легенды Ігара Лучанка і Уладзіміра Мулявіна «Гусляр» паводле паэмы Янкі Купалы «Курган», мюзікла-прытчы Ларысы Сімановіч «Апокрыф» паводле аднайменнага твора Максіма Багдановіча і рок-оперы Уладзіміра Мулявіна «Песня пра долю» па матывах паэмы Янкі Купалы «Адвечная песня». Салісты — Пётр Ялфімаў, Ян Жанчак, Кацярына Дзегцярова.

Напрыканцы хачу сказаць, што наш калектыў заўсёды, ва ўсе перыяды сваёй дзейнасці, імкнуўся несці людзям музыку — добрую, светлую, якая абуджае ў чалавеку імкненне да хараства, выхоўвае ў ім мастака, творцу, дае адчуванне найвышэйшай духоўнай сферы.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ** ■

---

Даты | Падзеі | Людзі

### 16 СНЕЖНЯ

**1498** год — заснаваны Полацкі манастыр бернардзінцаў. Дзейнічаў да 1832 года. Знаходзіўся пры ўпадзенні ракі Палата ў Заходнюю Дзвіну. Заснаваны вялікім князем літоўскім Аляксандрам з мэтай схілення праваслаўных гараджан да каталіцызму. Верагодна, тут атрымаў пачатковую адукацыю першадрукар Ф. Скарына. У пачатку XVII стагоддзя пабудаваны драўляны касцёл (згарэў у 1563 годзе падчас Лівонскай вайны, манахі збеглі). У 1696-м ваявода Д. Слушка зноў запрасіў бернардзінцаў у Полацк і размясціў іх у слабадзе Кабак. Пасля пажару 1758-га ўзведзены мураваны касцёл Маці Божай Марыі Нябеснай (асвячоны ў 1769 годзе) і жылы корпус. Пасля закрыцця касцёл ператвораны ў праваслаўную царкву (у 1930-х гадах быў моцна пашкоджаны). Захаваўся жылы корпус.

**1773** год — адбылася акцыя пратэсту амерыканскіх каланістаў, якая ўвайшла ў гісторыю як «Бостанскае чаяванне».



У той дзень амерыканскія каланісты выкінулі ў ваду скрыні з чаем, якія належалі англійскай Ост-Індскай кампаніі, у знак пратэсту супраць ўведзенага Вялікабрытаніяй падатку на гэтую прадукцыю. У 1773-м брытанскі ўрад выдаў «Чайны закон», які дазволіў Ост-Індскай кампаніі прадаваць чай у паўночнаамерыканскіх калоніях па цане ўдвая ніжэйшай, чым раней, а таксама танней, чым у Вялікабрытаніі і ў любых мясцовых чайных гандляроў і кантрабандыстаў. Многіх каланістаў новы закон абурыў. У Бостане расцанілі гэта як чарговую спробу Вялікабрытаніі спыніць рух за незалежнасць у калоніях. 16 снежня таго ж года група каланістаў, апранутая ў нацыянальныя касцюмы індзейцаў і ўзброеная сякерамі і дубінамі, пракралася на борт караблёў, загружаных чаем, хутка апустошыла трумы і выкінула за борт каля 45 тон чайнай прадукцыі. «Бостанскае чаяванне» стала адным з каталізатараў вайны за незалежнасць ЗША, паказаўшы імкненне народа трынаццаці калоній здабыць незалежнасць.

**1950** год — 65 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Усеваладавіч Чурыла, беларускі мастак. У 1976 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працуе ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве, мастацкім праектаванні, станковым жывапісе. Аўтар мастацкага афармлення станцый Мінскага метрапалітэна «Акадэмія навук», «Плошча Я. Коласа», «Пушкінская», Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, залаў прыёмаў Дома ўрада Беларусі, рэзідэнцый шэрагу замежных пасольстваў, жывапісных кампазіцый і інш.

**Было сказана**

**Ніна ТАРАС, паэтэса:**

*«Можа, шчасцем ад таго й завецца*
*Тое, што не можна паўтарыць».*

---

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

**Б**ЯСШЛЮБНАСЦЬ — стан дарослых людзей, якія пад прымусам нейкіх абставін ці па запавеце (клятве) ніколі не бралі шлюб. Такіх людзей у народзе звалі векавухамі ці халасцякамі. Функцыянальна сюды таксама адносілі людзей, якія былі ў шлюбе, але страцілі сваю «другую палавінку».

Раней да адзінокіх людзей ставіліся з пэўным адценнем асуджэння і спачування. Халастых, а значыцца, і бяздзетных людзей, не прымалі ў кампаніі жанатых, не запрашалі прымаць удзел у выкананні вясельных абрадаў (напрыклад, у сваты або ў каравайніцы), не бралі хроснымі бацькамі.

◈ Пасля сарака гадоў адзінокім (нежанатым) людзям усё часцей і часцей прыходзілася ўдзельнічаць толькі ў пахавальным абрадзе.

◈ На працягу года былі святы, калі грамада выказвала сваё ганьбаванне той моладзі, якая не стварыла сям'ю. Так, на Каляды незамужнім дзяўчатам у хату прыцягвалі вялікае бервяно, да якога маглі прывязаць дзяўчыну на некалькі дзён. А бацькі пакорна глядзелі на ўсё, а потым павінны былі выкупіць сваё дзіця. На Масленіцу халасцякам на ногі прывязвалі драўляную калодку, якую трэба было цягнуць аж да хаты або шчодра адкупіцца. Часам хлопец ці дзяўчына ў пакаранне за сваю ўпартасць ці «пераборлівасць» павінны былі цягнуць бервяно праз усю вёску. Такія меры вырашэння праблемы лічыліся вельмі эфектыўнымі, таму што пасля гэтага на вёсцы гулялі адразу некалькі вяселляў.

◈ Пасля смерці дзяўчыну, якая не ўзяла шлюб пры жыцці, сімвалічна аддавалі замуж. Яе хавалі ў вясельным строі. Казалі, што на тым свеце яна стане «нявестай Хрыстовай».

---

■ Аднаўленне гісторыі

# Пераміp'е заключылі ў Скоках

## Пад Брэстам адбылася маштабная рэканструкцыя падзей Першай сусветнай вайны

**Радавая сядзіба магнатаў Нямцэвічаў, адрэстаўраваная некалькі гадоў таму, стала адной са славутасцей Брэстчыны. Менавіта ў зале Скокаўскага палаца 15 снежня 1917 года быў падпісаны гістарычны дакумент, які азначаў заканчэнне вайны на фронце з Расіяй.**



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Падзеям Першай сусветнай вайны быў прысвечаны ваенна-гістарычны фестываль, што прайшоў у мінулыя выхадныя каля вёскі Скокі, якая знаходзіцца ў прыгарадзе Брэста. Гэта ўжо чацвёрты падобны фэст у Скоках. І з кожным годам колькасць яго ўдзельнікаў расце. Напрыклад, летась у названым мерапрыемстве выступалі 60 рэканструктараў з 12 клубаў Беларусі, Расіі, Украіны, а цяпер тут былі прадстаўлены 20 ваенна-гістарычных клубаў і 150 удзельнікаў з розных гарадоў названых краін.

Перад пачаткам рэканструкцыі прайшоў малебен у памяць загінулых падчас Першай сусветнай вайны.

— Усё, што адбываецца тут, служыць справе ўшанавання памяці тых вялікіх і трагічных падзей, — сказаў расійскі гісторык і тэлежурналіст з Санкт-Пецярбурга Віктар Праўдзюк. Ён, дарэчы, прыехаў у Скокі другі раз.

На пляцоўцы ля старадаўняга парку сабралася шмат гледачоў. І паглядзець сапраўды было на што. Арганізатары дзеі грунтоўна яе падрыхтавалі. У рэканструкцыі падзей удзельнічалі конная кавалерыя, падраздзяленні пехацінцаў. Тут жа разгарнулі палявы шпіталь. Быў нават франтавы мастак, які на працягу баёў зарысоўваў падзеі з натуры. І калі спачатку яго мальберт уяўляў з сябе белае палатно, то бліжэй да канца баявых дзеянняў на карціне праглядаўся канкрэтны эпізод бою.

Магутная піратэхніка стварыла эфект артпадрыхтоўкі. Дым, узрывы, выстралы, раненыя і забітыя ў час атак і контратак, а таксама пяхотныя ланцугі, траншэі, умацаванні, калючы дрот — гледачы назіралі ўжывую за тым, што раней даводзілася бачыць толькі ў кіно. Важна, што дзеянні, якія разгортваліся на «полі бою», каменціраваў вядучы. Такім чынам публіцы было лягчэй асэнсаваць, што адбываецца. Бо для непадрыхтаванага чалавека асобныя эпізоды часам маглі нагадаць толькі лермантаўскі радок, калі «смешались в кучу кони, люди...» А так станавілася больш-менш зразумела, хто за якую вышыню ваюе.

Але ж ваенна-гістарычны фестываль — гэта не толькі эпізоды 100-гадовай даўніны. Перад рэканструкцыяй у Скоках прайшла навукова-практычная канферэнцыя «Вялікая Еўрапейская вайна». На форуме прагучалі даклады, якія аднавілі некаторыя старонкі малавядомай нам вайны. На канферэнцыі, напрыклад, адзначалася, што падпісанае пагадненне аб спыненні дзеянняў на Усходнім фронце выратавала тысячы жыццяў. Таму асаблівай падзеяй фестывалю можна назваць адкрыццё памятнай дошкі, прысвечанай пераміp'ю, якое падпісалі 100 гадоў таму. Дошку замацавалі на валуне, які стаіць перад уваходам у гісторыка-мемарыяльны музей «Сядзіба Нямцэвічаў» .

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by* ■

---

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой заросшая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЗЯЛЕНІВА, ЯКОЕ ЛЁГКА ВЫРАСЦІЦЬ НА ПАДАКОННІКУ

## Яно не патрабуе асаблівых клопатаў, але пры гэтым нязменна радуе ўраджаем у самыя кароткія тэрміны

**Вырасціць дома можна практычна любую агародную культуру, але не ў кожнага ёсць магчымасці для гэтага. Таму найлепшыя расліны для хатняга агарода тыя, вырасціць якія зможа любы чалавек.**

### 1. Зялёная цыбуля



Напэўна, хоць раз у жыцці яе вырошчваў на падаконніку кожны, хай нават толькі з цікаўнасці. Ідэальная расліна для хатняга агарода: хутка расце, непатрабавальная, карысная.

У якасці пасадачнага матэрыялу можна выкарыстоўваць і буйную цыбулю-сеянку, і звычайную цыбулю-рэпку. З сеянкі (або дробнай рэпкі) ураджай, вядома, меншы: цыбуліна хутчэй высільваецца. Але пяро мякчэйшае і далікатнейшае. Акрамя таго, дробная цыбулька займае менш месца пры пасадцы. Буйная цыбуліна дае больш зеляніны, пяро ў яе, як правіла, буйнейшае, а атрымліваць ураджай з яе можна даўжэй.

Саджаць цыбулю на выганку можна ў невялікія ёмістасці з вадой або пажыўным растворам (так, каб цыбуліна ні ў якім разе не правальвалася ў ваду, а толькі дакраналася да яе) або ў грунт. Варта памятаць, што цыбуліны на вадзе часцяком пачынаюць падгніваць і спецыфічна пахнуць, а з грунтавымі такога казусу не здараецца.

У глебу для пасадкі вельмі добра ўнесці гідрагель, замочаны ў растворы Гумі (гэты біяпрэпарат умацоўвае расліны, дадаткова корміць іх, павышае ўстойлівасць да хвароб). У пакаёвых умовах глебавы субстрат перасыхае хутка, а гідрагель не дае цыбулінам пакутаваць ад дэфіцыту вільгаці.

Каб заўсёды быць з ураджаем, найлепш саджаць цыбульку рэгулярна — кожныя 10-14 дзён. Тады да таго моманту, як з першай «градкі» ўраджай будзе сабраны цалкам, паспее зеляніна на наступнай — і так да самай вясны.

Для пасадкі зручна выкарыстоўваць невялікія пластыкавыя скрыначкі. На дно трэба насыпаць керамзіт (адтулін для сцёку лішняй вільгаці ў іх няма, таму дрэнаж неабходны), зверху — грунт з гідрагеля прыкладна да паловы скрыні. Злёгку ўшчыльніўшы сумесь, высаджваем у яе цыбуліны блізка адна да адной, не заглыбляючы іх у глебу. Шчодра паліваем — і ўсё. А калі выкарыстоўваць прарослыя цыбуліны, то ўраджаю чакаць давядзецца зусім нядоўга.

### 2. Крэс-салата



Адна з найлепшых культур для хатніх агародаў. Па-першае, яна, як і цыбуля, выключна непатрабавальная. Тыя, хто не мае магчымасці або жадання марнаваць час на працаёмкі догляд за «градкамі» на падаконніку, гэта абавязкова ацэняць. Па-другое, яна вельмі хуткаспелая: ужо праз 2-3 тыдні пасля з'яўлення ўсходаў (а яны таксама не прымусяць сябе чакаць) вас парадуе маладая вітамінавая зеляніна. Па-трэцяе, прырода надзяліла крэс-салату мноствам карысных уласцівасцей: рэгулярнае ўжыванне ў ежу гэтай культуры дапамагае нармалізаваць крывяны ціск, палепшыць страваванне і сон. Яе выкарыстоўвалі як сродак ад цынгі, а сокам лячылі малакроўе і авітамінозы.

Калі ў вас ёсць дзеці, паспрабуйце пасеяць крэс-салату разам з імі, хоць бы дзеля эксперымента. Гэтая расліна з тых, з якіх варта пачынаць далучэнне да агародніцтва, бо няўдача практычна выключана!

Крэс-салата паспяхова расце на падаконніках нават зімой: яна вельмі холадаўстойлівая (ідэальнай для яе лічыцца тэмпература ад 15 да 18 градусаў) і непатрабавальная да святла. Адзінае, у чым яна мае патрэбу, — рэгулярнае ўвільгатненне глебы і паветра, бо засухі гэтая расліна не любіць. Каб зеляніна на стале была пастаянна, чарговую порцыю крэс-салаты рэкамендуецца высейваць кожныя 7—10 дзён.

### 3. Ліставая салата

Гэтая культура трохі больш патрабавальная, чым зялёная цыбуля і крэс-салата, але дзеля сакавітай зеляніны пастарацца варта. Што трэба ўлічыць? Па-першае, салаце ў хатніх умовах неабходна дадатковае асвятленне — гэта святлолюбівая культура.



Недахоп асвятлення прывядзе да ранняга ўтварэння кветканосаў. Праблема часткова вырашаецца выбарам гатункаў. Па-другое, салата адмоўна рэагуе на засуху і спякоту: лісце грубее і становіцца горкім, хутка ўтвараюцца кветканосы. Па-трэцяе, усходы салаты трэба прарэджваць. Рэкамендуецца рабіць гэта двойчы: праз тыдзень пасля з'яўлення ўсходаў на адлегласць 1-2 см паміж сеянцамі, а ў фазе 2-3 сапраўдных лістоў — на адлегласць 4-5 см. Калі загусціць пасевы, расліны выцягнуцца, аслабнуць, і ўраджаю вы, верагодна, не ўбачыце. Ад вырошчвання качанных формаў салаты ў хатніх умовах лепш адмовіцца да таго часу, пакуль не з'явіцца дастаткова вопыту: яны маюць патрэбу ў больш дбайным доглядзе, чым іх ліставыя сабраты, ды і вегетацыйны перыяд у іх, як правіла, даўжэйшы. Ліставую салату ў хатніх умовах дарошчваць да стандартных памераў, якіх яна дасягае ў агародзе, няма асаблівага сэнсу — досыць далікатных маладых лісточкаў.

### 4. Пятрушка



Зеляніну пятрушкі дома можна атрымаць двума шляхамі: пасевам насення ў грунт і выганкі з карэньчыкаў. Другі спосаб хоць і патрабуе некаторай папярэдняй падрыхтоўкі, але ўвогуле прасцейшы. Улічваючы асаблівасці сённяшняй зімы, пасадачны матэрыял цалкам можна здабыць на гародзе. У расліны абавязкова павінна захавацца верхавінная пупышка.

Добра ўвільгатняем глебу ў скрыначцы ці гаршку, саджаем караняплоды, прыкрываючы грунтам іх верхавіны. Занадта доўгія можна абрэзаць (зрэз прысыпаюць вугалем, каб пазбегнуць гнілі) або пасадзіць нахільна. Апошні варыянт лічыцца нават лепшым, чым звычайная пасадка.

Калі вырошчваць пятрушку з насення, неабходна ўлічыць два нюансы: расліна святлолюбівая, а яе насенне прарастае даволі павольна.

Халадоў пятрушка не баіцца, так што на падаконніку яна адчувае сябе выдатна. Асаблівых патрабаванняў да вільгаці расліна таксама не прад'яўляе: паліваем па патрэбе, у залежнасці ад умоў у памяшканні.

### 5. Шніт-цыбуля



Гэтая культура запатрабуе невялікай папярэдняй падрыхтоўкі. Каб усю зіму атрымліваць ураджай, з восені неабходна нарыхтаваць пасадачны матэрыял для выганкі. А паколькі восень у нас зацягнулася, то яшчэ і цяпер можна выкапаць невялікія кусцікі шніт-цыбулі і пасадзіць у скрыні ці гаршкі, якія захоўваюць у склепе або на балконе.

Іх па неабходнасці ўносяць у цёплае памяшканне і ставяць бліжэй да святла. Пяро ў шніт-цыбулі адрастае хутка: яго можна вышчыпваць з кусціка выбарачна або зрэзаць цалкам. У хатніх умовах ураджай з адной расліны можна атрымаць двойчы, пасля чаго яна высільваецца, нават пры добрым доглядзе і падкормках. Таму разумна нарыхтаваць некалькі ёмістасцяў з пасадачным матэрыялам, каб вырошчваць зеляніну на працягу ўсёй зімы. Ну, а ранняй вясной шніт-цыбуля адной з першых прарастае ў агародзе.

Матэрыял на выганку мэтазгодна браць з тых пасадак, якія вы збіраецеся прарэджваць або цалкам выдаляць: выкарыстаныя на выганку расліны ўжо не аднаўляюцца, і пасля канчатковай уборкі ўраджаю іх выдаляюць.

Важны нюанс: шніт-цыбуля вельмі адчувальная да вільгаці — пры яе недахопе пяро грубее і пачынае прыкметна гарчыць, хутка ўтвараюцца кветканосы.

---

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.23 | 16.47 | 7.24 |
| Віцебск — | 9.20 | 16.29 | 7.09 |
| Магілёў — | 9.13 | 16.37 | 7.24 |
| Гомель — | 9.00 | 16.42 | 7.42 |
| Гродна — | 9.36 | 17.04 | 7.28 |
| Брэст — | 9.28 | 17.13 | 7.45 |

### Месяц

***Першая квадра 18 снежня.***
***Месяц у сузор'і Рыбы.***

### Імяніны

***Пр.*** *Андрэя, Георгія, Івана, Мікалая, Савы, Фёдара.*
***К.*** *Аліцыі, Альбіны, Здзіслава, Себасцьяна, Яўсея.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




---

УСМІХНЕМСЯ

**Гэта пакуль у цябе дзяцей няма, ты — жаўрук ці сава. А потым усё — ты зомбі.**

— Доктар, скажыце, калі ласка, а якая дыета самая эфектыўная?
— Найлепшая дыета для вас, Вера Сямёнаўна, — гэта есці кефір... відэльцам!

**Муж цярпліва і моўчкі чакаў. Ішла другая гадзіна «празпяцьхвілінгатова».**

— Якія віды псіхалагічнага гвалту вы ведаеце?
— «Не чапай! Гэта на Новы год!»

**На маю фразу «Дык ты ж маё сонейка!» да мяне разам падышлі сын, сабака, кошка і на ўсялякі выпадак з калідора выглянуў муж.**




Малюнак Алега КАРПОВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4984.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 снежня 2015 года.